

# «УСЁ, ЗА ШТО МЫ БЯРОМСЯ, ВЫРАШАЕМ ГРУНТОЎНА»

**Што абмяркоўвалі Прэзідэнты Беларусі і Расіі падчас сустрэчы ў Крамлі**

(Працяг на 2–3-й стар.)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
14 САКАВІКА 2025 г. ПЯТНІЦА № 51 (30439)

НА СЛУЖБЕ ПАСАЖЫРАМ

## ВОЗІМ ХУТКА, ЯКАСНА, БЯСПЕЧНА!

**Сёння жыхароў і гасцей амаль двухмільённага Мінска перавозіць больш за 2000 адзінак аўтамабільнага і электрычнага транспарту**



Кіроўца трамвая Валянціна БУРАЯ.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Многія чулі сцвярджэнне, што транспарт — гэта крывяносная сістэма эканомікі краіны. Каб пераканацца ў справядлівасці гэтых слоў, дастаткова на хвіліну ўявіць, што транспарт, які перавозіць пасажыраў, раптам спыніўся хоць бы на гадзіну... Але такога, на шчасце, у нас не здараецца. Увесь наземны транспарт сталіцы працуе як гадзіннік — пачынае раней за ўсіх і заканчвае, калі ўжо адлічвае хвіліны новы дзень.

СТАР. 8–9

ПА ПАЛІЧКАХ

## СУМОЎІ ДЛЯ ІНЖЫНЕРАЎ І ЭЛЕКТРОННАЯ ЧАРГА ДЛЯ ЎСІХ

**Якія новаўвядзенні чакаюць тых, хто сёлета паступае ў ВНУ**

У 2025-м скончаць школу каля 56 тысяч адзінаццацікласнікаў. Наперадзе іх чакаюць выпускныя і ўступныя іспыты — здача цэнтралізаваных экзаменаў і тэсціравання, канчатковы выбар спецыяльнасці, ВНУ або каледжа. Да вырашальнага перыяду — усяго пара месяцаў, уступная кампанія гэтага года афіцыйна пачнецца ў канцы мая правядзеннем ЦЭ і ЦТ, у канцы чэрвеня падаваць дакументы ў навучальныя ўстановы пачнуць мэтавікі, а ў ліпені — усе астатнія. Скончыцца прыёмная кампанія ў вышэйшыя навучальныя ўстановы ў пачатку жніўня. У Міністэрстве адукацыі запэўнілі, што прынцыповых змяненняў у правілы прыёму не прадугледжана. Аднак ёсць некаторыя нюансы, пра якія расказаў начальнік Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі ведамства Сяргей ПІШЧОЎ.

СТАР. 7



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.



**+TV ПРАГРАМА**

**«Зусім чужыя»**
**Меладрама**
Аўторак, 18 сакавіка



НА КНІЖНЫМ ФОРУМЕ — ЦІКАВЫЯ ПАДЗЕІ 6



НЕ СПІЦЦА? НАВУКА ДАПАМОЖА! 10

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby.**
**Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

TikTok

ISSN 1990 — 763X
25051>
9 771990 763008

# «УСЁ, ЗА ШТО МЫ БЯРОМСЯ, ВЫРАШАЕМ ГРУНТОЎНА»

## Што абмяркоўвалі Прэзідэнты Беларусі і Расіі падчас сустрэчы ў Крамлі

Амаль адразу пасля прэзідэнцкіх выбараў Аляксандр Лукашэнка анансаваў, што першы свой міжнародны візіт ён здзейсніць у Расійскую Федэрацыю. Учора Прэзідэнт Беларусі прыбыў з афіцыйным візітам у Маскву. Сустракалі беларускага лідара з урачыстымі атрыбутамі: з ротай ганаровай варты, выкананнем гімнаў... Пасля Аляксандр Лукашэнка падзякуе расійскага калегу за такі пачатак: «Трэба гэта дэманстрацыя для беларусаў, расіян, што мы разам. Што мы з'яўляемся суверэннымі незалежнымі дзяржавамі, але ў той жа час мы — родныя людзі».

У Крамлі прайшлі перагаворы з Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Пуціным. Кіраўнікі дзяржаў у фармаце адзін на адзін, а затым у пашыраным складзе з удзелам членаў дэлегацый абмеркавалі развіццё супрацоўніцтва Беларусі і Расіі, перспектыўныя кірункі ўзаемадзеяння. У цэнтры ўвагі таксама была сумесная работа ў інтэграцыйных фарматах. Лідары краін абмяняліся меркаваннямі па пытаннях бягучай міжнароднай сітуацыі. Па выніках перагавораў быў падпісаны пакет дакументаў.



Фота БелТА.

### УЗОР АДНОСІН ПАМІЖ КРАІНАМІ

Уладзімір Пуцін падчас размовы ў фармаце «адзін на адзін» павіншаваў беларускага калегу з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Беларусі і заўважыў, што краінай для першага візіту стала Расія. «Паважаны Аляксандр Рыгоравіч, вельмі рады вас бачыць. Вельмі прыемна, што вы свой першы візіт пасля перавыбрання ў якасці Прэзідэнта Беларусі вырашылі здзейсніць менавіта ў Расію», — сказаў ён.

Гэта, паводле слоў Уладзіміра Пуціна, і зразумела, таму што паміж Беларуссю і Расіяй даўно склаліся асаблівыя адносіны — саюзніцкія, брацкія ў прамым сэнсе слова. «Мы пастаянна аб гэтым гаворым, але з улікам афіцыйнага характару вашага візіту не лішнім будзе ўспомніць яшчэ раз. У нас гістарычныя сувязі, роднасная сувязь паміж вялікай колькасцю людзей. У нас сёння развіваюцца адносіны такім чынам, што яны маглі б быць прыкладам для адносін паміж многімі іншымі краінамі і ў сферы эканомікі, і ў сферы забеспячэння бяспекі, і нашага супрацоўніцтва на міжнароднай арэне, перш за ўсё на пляцоўках ААН, у ШАС, дзе Беларусь стала паўнапраўным членам арганізацыі, у БРІКС, дзе Беларусь таксама набыла статус партнёра», — падкрэсліў Прэзідэнт Расіі.

Што да эканамічнага супрацоўніцтва, то ў гэтай сферы, паводле яго слоў, усё развіваецца найлепшым чынам, нягледзячы на рознага роду складанасці. Беларуска-расійскі тавараабарот за 2024 год, паводле даных беларускага боку, вырас на 6,3 % і дасягнуў рэкорднага ўзроўню 51,8 млрд долараў.

«Прычым работа ідзе як у звычайным рэжыме, так і на перспектыву. Мы адкрываем новыя кірункі ўзаемадзеяння. З вашай падачы мы пачалі прапрацоўку, і актыўна, пазітыўна ідзе работа, напрыклад у сферы авіябудавання», — заўважыў Уладзімір Пуцін.

Акрамя таго, развіваюцца двухбаковыя адносіны ў сферы культуры, адукацыі, спорту. Сёлета, напрыклад, у Беларусі пройдуць Дні расійскай культуры і Дні расійскага кіно. Больш за 80 суб'ектаў Расіі падтрымліваюць адносіны на рэгіянальным узроўні са сваімі партнёрамі ў рэгіёнах Беларусі. «Увогуле, практычна па ўсіх напрамках ідзе актыўная работа», — абагульніў Прэзідэнт Расіі. Ён таксама звярнуў увагу на дзелавы, насычаны характар візіту кіраўніка беларускай дзяржавы ў Расію.

Прэзідэнт Расіі таксама паўтарыў сваё запрашэнне Аляксандру Лукашэнку наведаць парад у Маскве да 80-годдзя Перамогі 9 мая гэтага года. Акрамя таго, ён нагадаў аб запланаваным правядзенні ў Валгаградзе маштабнага форуму, прысвечанага 80-годдзю заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, і запрасіў беларускі бок да ўдзелу ў гэтым мерапрыемстве.

***Традыцыйна беларускага лідара яшчэ на ўваходзе ў Крэмль чакалі журналісты, разлічваючы задаць яму некалькі пытанняў. І традыцыйна Аляксандр Лукашэнка на іх адказаў.***

### Аб планах амерыканцаў па канфлікце ва Украіне

«Абсалютна дакладна магу сказаць, што ў амерыканцаў няма ніякага плана па канфлікце ва Украіне. Абсалютна няма. Яны што робяць (можа, так, агульныя рысы, спыніць вайну і іншае) — яны зандзіруюць глебу. Мы аб гэтым сёння пагаворым. Уладзімір Уладзіміравіч (Пуцін. — **«Зв.»**) мне раскажа, што гаварылі ў Саудаўскай Аравіі і іншае. Яны зандзіруюць глебу: а што гэтыя хочуць? А што гэтыя? На гэтых націснем — можна націснуць. На гэтых не націснеш», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Што, на Расію (можна націснуць. — **«Зв.»**)? Мы даўно абмяркоўвалі гэту праблему. Што, Дональд прыйдзе і кулаком стукне — усё. Ці санкцыі ўвядуць? Дык ужо ўвялі супраць нас столькі санкцый, што ўжо далей няма куды, — заўважыў беларускі лідар. — Таму націснулі на Украіну, — а ёй што, дзявацца няма куды — 30 дзён, дык 30 дзён. Яны і кажуць, што згодныя на 30 дзён. Расіяне, калі гэтыя 30 дзён (калі будзе ўстаноўлена перамір'е. — **«Зв.»**), ну ўсё роўна эканоміка будзе працаваць, ВПК будзе працаваць, яны будуць вырабляць узбраенне і іншае. Ну добра, на фронт не павязём, складзіруем гэта ўсё... А ва Украіне руху не павінна быць ніякага. Бо яны ж з-за мяжы перакідваюць узбраенні. Як толькі заўважылі — усё, парушэнне».

Аляксандр Лукашэнка мяркуе, што Украіна можа з гэтым і не пагадзіцца: «Яны думаюць, што мы адмовімся — расіяне адмовяцца ад гэтага. І ў іх будзе гэты козыр, пра які гаварыў Трамп, гэта значыць, тут яшчэ столькі гэтых платоў і хламу, што нам спяшацца не трэба».

Прэзідэнт у гутарцы з журналістамі параіў не весціся на хітрыкі Дональда Трампа: «Таму што ён у гэтых адносінах ваш чалавек — ён медыйны, ён можа заявы рабіць: раніцай адна, вечарам — другая. І лёгка ўвесці нас, вас у зман. Таму мая вам парада: толькі факты! А факты сёння такія, што заўтра-паслязаўтра Курскую вобласць вызваляць наогул». Аляксандр Лукашэнка таксама заявіў, што для ўкраінцаў цяпер дрэнна складваецца абстаноўка на фронце, у тым ліку ў раёне Пакроўска.

### Аб ваяўнічых заявах еўрапейскіх лідараў

Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў прапанаваны план кіраўніка Еўракамісіі Урсулы фон дэр Ляен аб пераўзбраенні Еўропы коштам 800 млрд еўра, а таксама прапанаваны Прэзідэнтам Францыі Эмануэлем Макронам «ядзерны парасон» для саюзнікаў у ЕС.

«Ім бы гэты «парасон» трэба над Францыяй не страціць. А не тое, што яны гэты «парасон» над усёй Еўропай будуць трымаць. Гэта папершае. Па-другое, яны няхай «парасон» свой паднімуць хаця б над Германіяй. Або, вобразна кажучы, падзеляцца ядзернай зброяй з Германіяй — вечным гістарычным сваім ворагам. Нібыта цяпер замірыліся. Хто яго ведае... У іх прэтэнзій адзін да аднаго — каласальнае мноства. У палякаў з немцамі, ведаеце... Там супярэчнасцяў куча», — сказаў краўнік дзяржавы.

Што датычыцца плана пераўзбраення, Аляксандр Лукашэнка заўважыў: «Няхай яны яшчэ дамовяцца аб 800 мільярдах і падумаюць, дзе яны возьмуць гэтыя 800 мільярдаў».

«Ёсць іншы шлях. Абсалютна адкрыты, сумленны, мірны шлях. Да гэтага падштурхоўвае і канфлікт ва Украіне. Хопіць, наваяваліся, давайце ўжо жыць дружна і выбудоўваць нармальную палітыку, — заклікаў беларускі лідар. — А потым, вы ж бачыце, самае галоўнае — народы там (у Еўрасаюзе. — **«Зв.»**) узняліся. Яны ж прызвычаіліся жыць добра, у тым ліку і за кошт нас, асабліва Расіі: танныя рэсурсы. За кошт гэтага прыбытак добры. Усе прывыклі добра жыць, а тут гэтага няма».

«Таму Урсула, напэўна, ні разу не бачыла не тое што сучасныя сродкі паражэння — ракеты і іншае, — яна пісталета нармальнага не бачыла, а ўжо думае глабальна ў плане ўзбраенняў, стварэння еўрапейскай арміі», — заўважыў Прэзідэнт.

«Ну і Дональд (Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп. — **«Зв.»**) жа вы бачыце, якую пазіцыю заняў. Так і хочацца сказаць: хто ім дасць гэта зрабіць?» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## «НАШЫ ЛЮДЗІ ВЫДАТНА РАЗУМЕЮЦЬ, ДЗЕ НАШЫ СЯБРЫ»

Аляксандр Лукашэнка заявіў аб народнай падтрымцы ў Беларусі курсу на супрацоўніцтва з Расіяй, што прадэманстравалі і вынікі прэзідэнцкіх выбараў.

«Я доўга думаў аб тым, што можна сказаць аб нашых адносінах. Яны сапраўды, як вы сказалі, дасягнулі вельмі высокага ўзроўню. Мы ствараем унікальнае аб'яднанне ў выглядзе Саюзнай дзяржавы, якому няма прыкладаў у гісторыі. Мы ідзём непратаптанай дарогай. Гэта няпроста. Але, як вы сказалі, у нас ёсць добрае люстэрка, дзе мы можам бачыць нашы крокі. А гэта эканоміка, гандлёва-эканамічныя адносіны. І з кожным годам (пры ўсіх праблемах — яны былі і будуць) мы прырастаем. Гэта сведчыць аб тым, што мы рухаемся ў нармальным кірунку», — сказаў Прэзідэнт.

Гаворачы аб прэзідэнцкіх выбарах, што прайшлі ў Беларусі, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу: у ходзе такіх палітычных кампаній заўсёды так ці інакш стаіць пытанне аб пэўным выбары вектара паміж Усходам і Захадам.

«Нашы выбары — гэта заўсёды адзін бок і другі. Другі бок, як у вядомым фільме гаварылі, разбегся. Частка невялікая збегла на Захад. Але ўсё ж у Беларусі яны ёсць, сталіся. Дзесьці хтосьці маўчыць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У сувязі з гэтым ён канстатаваў вельмі высокую яўку выбаршчыкаў на мінулых выбарах і працэнт галасоў, які быў аддадзены ў падтрымку дзеючага Прэзідэнта. «Хоць з усіх бакоў стрымлівальныя фактары былі. Усе нашых людзей прытрымлівалі. У СМІ (апазіцыйных. — **«Зв.»**) і іншае, каб яны не хадзілі на выбары», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што амаль 87 % выбаршчыкаў прагаласавалі ў яго падтрымку. «А гэта ж было галасаванне: «Мы з Расіяй, усходні наш вектар, тут наша калыска ці недзе там?» Ну вось адказ. Народ даў адказ. І ў нас гэта пытанне, як галоўнае пытанне, ціха, непублічна, заўсёды стаяла. Гэта асаблівасць нашых выбараў усіх. Таму вы ніколькі не сумнявайцеся. Не толькі я, мае калегі — члены ўрада, дэпутаты — прыхільнікі самых цесных нашых адносін, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Мы пацвердзілі гэта ў нашай адзінай барацьбе сённяшняй, вастрыём якой з'яўляецца канфлікт ва Украіне. Мы заўсёды прытрымліваліся падобнага курсу. І вельмі важна, што народ прадэманстраваў. Нашы людзі выдатна разумеюць, дзе нашы сябры, а дзе нашы праціўнікі, ворагі і сапернікі».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў калегу за пачатак афіцыйнага візіту. «Патрэбна гэта дэманстрацыя для беларусаў, расіян, што мы разам. Што мы з'яўляемся суверэннымі незалежнымі дзяржавамі, але ў той жа час мы — родныя людзі. Што будзем прасоўваць і ў далейшым», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Паміж намі, я знайшоў на парадак менш праблем, чым праблем, якія існуюць глабальна і наогул у нашым рэгіёне. Мы ў гэтым плане паспяхова працуем. Вядома, ёсць пэўныя пытанні. Я думаю, мы іх закранём у больш шырокім складзе, калі спецыялісты будуць. Але мы ведаем гэтыя пытанні», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Хацелася б, можа быць, каб мы хутчэй тут рухаліся, але не заўсёды гэта атрымліваецца. І не толькі таму і не столькі гэта залежыць ад нас з вамі. Гэта залежыць і ад знешніх абставін. Мы гэта цудоўна разумеем. Усё, за што мы бяромся, вырашаем грунтоўна. Як, напрыклад, імпартазамяшчэнне, супрацьстаянне гэтым санкцыям. Усе думалі, што мы ўжо рухнем праз год. Але жывыя-здаровыя. Я ўпэўнены, што мы будзем жыць. Нам патрэбна крыху больш часу. І, можа быць, больш настойлівасці. Але нам гэта не пазычаць, у нас гэта ў крыві», — упэўнены беларускі лідар.

### Аб перамір'і ва Украіне

Адказваючы на пытанне, ці не хітрасць — прапанова з боку ЗША аб 30-дзённым перамір'і ва Украіне, Прэзідэнт сказаў: «Не, яны нас ужо не зловяць. І Расію тым больш. Увесь час жа хітрыкі ды хітрыкі. То падманулі, то яшчэ што. Час ужо нам галавой думаць. Сёння-заўтра Уладзімір Уладзіміравіч (Пуцін. — **«Зв.»**) будзе размаўляць з прадстаўнікамі Трампа на гэту тэму. Там жа куча пытанняў, акрамя 30-дзённага перыяду. Гэта трэба ў цэлым, пакетам узважваць і прымаць рашэнне, якое адпавядае. Не, гэта не хітрасць і не будзе хітрасцю. Не будзе, бо мы ведаем, што нам трэба. Яны ведаюць, чаго мы хочам. Таму хітрасцю не будзе. Потым, каб гэта не было хітрасцю, трэба з іншага боку абстаўляцца нармальна. Калі гэта перамір'е, значыць, усё замерла і ніякага руху. Але на гэта, хутчэй за ўсё, украінцы не пагодзяцца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

### Аб тым, што трэба, каб перагаворы пачаліся

«Калі шчыра, трэба, каб расіяне пагадзіліся. Ім складана цяпер пагадзіцца з-за таго, што на фронце ў іх лягчэй. Таму ў іх вялікія козыры, як Трамп казаў, у руках».

«Вось калі яны гэтыя козыры зберагуць, а не дастануць і не пачнуць у гэтай картачнай гульні выйграваць, тады дамовімся», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

### Аб «Арэшніку» ў Беларусі

«Яшчэ няма «Арэшніка». Працуем. Але калі я паглыбіўся ў гэту праблему (Уладзімір Уладзіміравіч мяне паглыбіў), аказалася, што, акрамя ракеты, гэта ўсё трэба выраблядзь. І мы гэта робім у Беларусі. Таму мы працуем над гэтым. Некалькі пускавых установак, якія для «Арэшніка» прызначаны, — мы сёння ўжо фактычна заканчваем выраб. Ад старэйшага брата (Расіі. — **«Зв.»**) ракета патрэбна будзе», — расказаў кіраўнік дзяржавы.

## Прэс-канферэнцыя

***Па выніках перагавораў Прэзідэнты сустрэліся з журналістамі, расказалі, аб чым дамовіліся, і адказалі на пытанні.***

### «ПАТРЭБНЫ ТЭХНАЛАГІЧНЫ ПРАРЫЎ»

Перагаворы са сваім расійскім калегам Аляксандр Лукашэнка назваў насычанымі і прадукцыйнымі. Але, па яго словах, у чацвер прайшла толькі трэць перагавораў, яны працягнуцца і ў найбліжэйшыя дні, для таго каб не толькі «ўтрэсці міждзяржаўныя адносіны, але і падумаць аб перспектывах». Па словах беларускага лідара, перспектывы трэба вызначыць. «Час ідзе хутка і паставіў перад намі нямала пытанняў. Мы дамовімся і вызначым найлепшыя перспектывы нашага супрацоўніцтва», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў, што на перагаворах былі яшчэ раз разгледжаны асноўныя кірункі развіцця супрацоўніцтва Беларусі і Расіі, прыярытэты Саюзнай дзяржавы на найбліжэйшую і сярэднетэрміновую перспектыву, Прэзідэнты абмяняліся думкамі і аб бягучай міжнароднай сітуацыі — у глабальным і рэгіянальным разрэзе. Лідары пацвердзілі актуальнасць падпісаных у снежні мінулага года Дагавора аб гарантыях бяспекі ў рамках Саюзнай дзяржавы і Канцэпцыі бяспекі Саюзнай дзяржавы. Абмеркавалі перспектывы ўзаемадзеяння ў рамках ЕАЭС, дзе Беларусь старшынствуе сёлета, СНД, АДКБ, ШАС, БРІКС у духу канцэпцыі Вялікага Еўразійскага партнёрства, ці інтэграцыі інтэграцый. «Я, Уладзімір Уладзіміравіч, вельмі вам удзячны за ўсё, што вы зрабілі, усё, што абяцалі і не абяцалі для ўступлення нашай краіны ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва. І практычна ў БРІКС, — так, мы партнёры, але мы маем магчымасць на гэтай пляцоўцы жыць і працаваць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Падчас перагавораў гаварылі і пра перспектывы вяртання да нармальнага, цывілізаванага дыялогу на міжнародных пляцоўках па шэрагу актуальных тэм глабальнага характару, расказаў беларускі лідар. Па яго словах, не абышлі ўвагай і новую сітуацыю ў пытанні ўрэгулявання канфлікту ва Украіне. «Уладзіміру Уладзіміравічу яшчэ сёння і заўтра прыйдзецца шчыльна працаваць па гэтым пытанні. Мы таксама абмяркуем перспектывы, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Нам на нешта вялікае разлічваць не трэба ў гэтай сітуацыі. **Трэба верыць фактам. Факт абмяркоўваем, прымаем ці не прымаем. А розная роду заявы і абяцанні — гэта пакуль заявы і абяцанні».** Разам з тым, па словах Аляксандра Лукашэнкі, бачныя і некаторыя пазітыўныя тэндэнцыі ў геапалітычных раскладах, але пакуль яны не сталі глабальнымі трэндамі.

### «ВЫПРАБАВАННІ ПРЫМУСІЛІ НАС ЗАДУМАЦЦА»

«Незаконныя эканамічныя санкцыі шэрагу дзяржаў нікуды не зніклі. У нечым яны нам дапамаглі. Мы таксама сышліся ў гэтым з Уладзімірам Уладзіміравічам. Ціск на Беларусь і Расію не слабее. Хоць ужо ўсім зразумела, што гэтыя абмежаванні больш б'юць па тых краінах, якія іх і ўвялі. І нам далі магчымасць сур'ёзна падумаць аб перспектывах нашага развіцця. І перакаталі нас у тым, што праз пэўны час мы пераадолеем гэты ціск поўнасцю, — заявіў беларускі лідар. — З іншага боку, **калі б не было гэтых выпрабаванняў, іх трэба было б прыдумаць. Яны прымусілі нас задумацца аб самадастатковасці, важнасці апоры на ўласныя сілы, харчовай бяспецы і тэхналагічным суверэнітэце».** Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што многія пытанні тры гады здаваліся нам непераадольнымі, напрыклад у мікраэлектроніцы. Пасля ўвядзення санкцый было шмат хваляванняў, як тэхніка будзе працаваць без замежных чыпаў. Але праблема была вырашана. «Аказваецца, у нас з вамі былі рэзервы, якія мы недаацэньвалі. І мы іх выявілі, знайшлі і развіваем», — заўважыў Прэзідэнт.

Беларускі бок вельмі цэніць падтрымку расійскіх калег, якія адкрылі нам доступ да свайго велізарнага рынку, дапамаглі пераарыентаваць лагістыку таварных патокаў. Тое, што калісьці прадавалася праз парты Літвы ці Латвіі, сёння прадаецца праз расійскія парты. Беларусы поўнасцю пераарыентаваліся. «Сёння работа ў гэтым кірунку працягваецца. Патэнцыял у транспартнай сферы ў нас вялікі. Прыйшоў час сур'ёзна падумаць над больш эфектыўным яго выкарыстаннем. Найперш магчымасці чыгуначнага транспарту. У нас мільёны тон грузаў, якія мы можам грузіць, найперш у Піцеры. Але, як аказалася, чыгунка ў нейкай ступені не вытрымлівае гэтага патоку. Нам не хацелася б (хаця прыходзіцца) сыходзіць у іншыя парты, хаця і з вялікімі затратамі. Мы над гэтым пачалі працаваць. І, думаю, мы гэта рэалізуем», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Уладзіміру Пуціну за абяцанне пабудаваць высакахуткасную чыгунку ад Масквы да Мінска. І нагадаў, што першапачаткова абмяркоўвалася будаўніцтва такой дарогі да Брэста.

### «МОЖАМ УСЁ»

Прэзідэнт адзначыў шчыльнае ўзаемадзеянне па імпартазамяшчэнні. Беларускія кампаненты і вузлы працуюць у аўтамабілях і самалётах, што збіраюцца ў Расіі, нашы грузавікі і самазвалы паспяхова замянілі заходнія аналагі ў кар'ерах і на вуліцах гарадоў. Беларускія прадукты харчавання, абутак, адзенне добра вядомыя пакупнікам як у Смаленску, так і Сахаліне. «Будзем рады дапамагчы і ў рэалізацыі новых амбіцыйных нацыянальных праектаў», — сказаў беларускі лідар. У прыклад ён прывёў вытворчасць беспілотнікаў, якія нядаўна былі прадстаўлены ў Беларусі. Падчас наведвання выстаўкі Прэзідэнтам была дасягнута дамоўленасць аб супрацоўніцтве ў гэтай сферы. «Значыць, можам усё. І для гэтага трэба няшмат часу», — заўважыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што са сваім расійскім калегам яны думаюць ужо не толькі аб адначасовым росце і імпартазамяшчэнні, але і аб апераджальным развіцці. Штосьці па асобных кірунках ужо пачалі рабіць. **«Беларусі і Расіі патрэбны тэхналагічны прарыў у імя будучыні нашых краін і народаў. Усё неабходнае для гэтага ў нас ёсць. Нават больш, чым трэба. Трэба крыху часу,** — перакананы беларускі лідар. — Кірункі руху таксама вядомыя: штучны інтэлект, квантавыя і біятэхналогіі, мікраэлектроніка, робататэхніка, новыя матэрыялы, тэрмаядзерны сінтэз, вытворчасць беспілотных лятальных апаратаў і многае іншае. Што мы не можам рабіць? Мы ўжо гэта робім. Можа, не ў тым аб'ёме, што трэба. Але ўмеем і можам рабіць».

Таксама паспяхова развіваецца беларуска-расійскае супрацоўніцтва ў сацыяльнай і гуманітарнай сферах. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, істотным крокам наперад стане падпісанне пратакола аб унясенні змяненняў у Дагавор паміж Беларуссю і Расіяй аб роўных правах грамадзян ад 1998 года. «Гэта дасць магчымасць беларускім грамадзянам выбіраць і быць выбранымі ў мясцовыя органы ўлады. Расіяне ў нас гэтым правам ужо карыстаюцца», — удакладніў ён.

### «МЫ ЧУЖОГА НЕ ХОЧАМ. І СВАЙГО НЕ АДДАДЗІМ»

У Беларусі і Расіі шмат сумесных планаў і праектаў на 2025 год. Зразумела, найважнейшы з іх — гэта святкаванне 80-годдзя Вялікай Перамогі над фашызмам. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Уладзіміру Пуціну за тое, што Расія ідзе ў авангардзе адстойвання памяці аб той вайне і Вялікай Перамозе. «Для нас, беларусаў, вялікі гонар — узяць удзел у юбілейным Парадзе Перамогі на Краснай плошчы ў Маскве 9 мая 2025 года. Мы памятаем і шануем гераічны подзвіг савецкага народа, нашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў. Галоўнае сёння — быць вартымі іх памяці, не дапусціць рэабілітацыі нацызму і перапісвання гісторыі», — сказаў ён.

«Дзякуючы паслядоўнай, узважанай і адказнай знешняй палітыцы Беларусь і Расія сёння знаходзяцца ў авангардзе барацьбы за справядлівае светаўладкаванне. І не першы год мы гэта робім, — заявіў Прэзідэнт. — Нашы краіны могуць і павінны выступаць арыенцірам для партнёраў у вырашэнні складаных праблем сучаснасці, захаванні і абароне агульных каштоўнасцяў, узаемадапамогі ў рэалізацыі нацыянальных інтарэсаў на прынцыпах раўнапраўя і павагі».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што з Прэзідэнтам Расіі яны дамовіліся пераадолець усё. **«Мы нічога чужога не хочам. Але дакладна дамовіліся: свайго не аддадзім. На гэтым цвёрда стаялі і будзем стаяць»,** — рэзюмаваў беларускі лідар.

Уладзімір Пуцін заўважыў, што гэта першы замежны візіт Аляксандра Лукашэнкі пасля пераабрання на пасаду Прэзідэнта Беларусі. «Мы такі крок высока ацэньваем. Тым самым падкрэсліваецца асаблівы характар адносін паміж дзвюма нашымі брацкімі краінамі», — сказаў ён. Па словах расійскага лідара, нашы краіны не толькі найбліжэйшыя суседзі, але і надзейныя саюзнікі — сапраўдныя стратэгічныя саюзнікі і сапраўдныя сябры.

*Працяг на 4-й стар.* ►

«У аснове нашага супрацоўніцтва ляжаць непарушныя прынцыпы ўзаемнай павагі і ўліку інтарэсаў адзін аднаго, а таксама шматвяковая сумесная гісторыя, роднасная сувязь, якая склалася паміж многімі расіянамі і беларусамі, прыхільнасць да агульных маральных і духоўных каштоўнасцяў», — сказаў Уладзімір Пуцін.

## «МЫ НАМЕРАНЫ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ТОЛЬКІ ТОЕ, ШТО НАМ ПАТРЭБНА»

Пытанні ад беларускіх і расійскіх журналістаў былі прысвечаны самым актуальным тэмам. У прыватнасці, прадстаўнікі СМІ пацікавіліся, ці паўплывае нармалізацыя адносін паміж Вашынгтонам і Масквой на супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы, на ўмацаванне тэхналагічнага суверэнітэту.

Уладзімір Пуцін заўважыў, што заходнія партнёры зрабілі добрую «прышчэпку» ў пытаннях самастойнасці і суверэнітэту. Таму, па яго словах, усе саюзныя праграмы, звязаныя з умацаваннем тэхналагічнага суверэнітэту, будуць працягнуты. Па словах Прэзідэнта Расіі, дзверы для замежных кампаній, якія захочуць вярнуцца на рынак, не зачынены. Але ім прыйдзецца мірыцца з тым, што некаторыя нішы могуць быць заняты айчыннымі вытворцамі.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў ваенны тэзіс свайго расійскага калегі аб тым, што Расія гатова вярнуцца да перагавораў з Украінай з улікам абстаноўкі на зямлі. І прапанаваў перанесці яго на «грамадзянскае поле» — заходнія кампаніі вяртаюцца, але з часам змянілася сітуацыя, змяніліся ўмовы — і яны павінны гэта ўлічваць. «Я мяркую, што мы ўжо будзем глядзець: «Вы хочаце гэтага? Добра, прыходзьце, вы нам тут патрэбныя. Калі не — значыць, не». Сітуацыя змянілася, мяч на нашым баку, і мы ведаем, чым адказаць. Трэба разумець, што за гэтыя тры гады мы пад жорсткім прэсам, а прэс заўсёды садзейнічае мабілізацыі. Мабілізаваўшыся, шмат чаго зрабілі. Таму **мы намераны ісці сваім шляхам і выкарыстоўваць толькі тое, што нам патрэбна»**, — растлумачыў беларускі лідар.

## «У НАС АДЗІНАЯ ПАЗІЦЫЯ»

Не абышлося і без самай вострай тэмы — заканчэння канфлікту ва Украіне. Журналісты пацікавіліся, ці каардынуюць Мінск і Масква свае пазіцыі па мірным працэсе. Уладзімір Пуцін адказаў: расійскі бок згодны з прапановамі спыніць баявыя дзеянні. «Але зыходзім з таго, што гэта спыненне павінна быць такім, якое прывяло б да доўгатэрміновага міру і ліквідавала б першапачатковыя прычыны гэтага крызісу», — адзначыў ён.

Пазіцыя беларускага боку, не раз агучаная публічна Прэзідэнтам Беларусі, — неабходна дамаўляцца аб міры — нязменная. І ён паўтарыў яе яшчэ раз. **«У нас адзіная пазіцыя з Расійскай Федэрацыяй. Была даўно і ёсць цяпер. Усе дамоўленасці, якія ў тым ліку датычацца канфлікту ва Украіне, мы свята выконвалі перад нашымі саюзнікамі і сябрамі. Мы гэтай пазіцыі будзем прытрымлівацца і цяпер»**, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, не Расія і не Беларусь былі асноўнымі прычынамі таго, што адбываецца ва Украіне. Ён нагадаў пра перагаворы ў Беларусі, якія праводзіліся літаральна ў першыя дні вайны. І ўжо тады гучалі заклікі вырашыць канфлікт мірным шляхам. Прэзідэнт Беларусі нагадаў, што казаў аб гэтым і Уладзіміру Зяленскаму. «Я яму тады сказаў: «Запомні, гэта класіка гісторыі, заўтра ў Амерыцы зменіцца кіраўніцтва, і дзе будзеш ты?». І як у ваду глядзеў, — расказаў Аляксандр Лукашэнка. — Украінцам трэба было даўно спыніць усякі агонь і сесці за стол перагавораў». Беларускі лідар нагадаў, што карані канфлікту ідуць яшчэ з часоў папярэдняга прэзідэнта Украіны Пятра Парашэнкі, які не здолеў ці не захацеў вырашыць усе праблемныя пытанні, спыніць канфлікт на Данбасе.

«Калі расіяне дамовяцца з ЗША — труба Еўропе і Украіне, разам узятым. У перагаворным працэсе Расіі і ЗША, у іх руках сёння знаходзіцца лёс Еўропы, якая павяла сябе і паводзіць сябе недальнабачна», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што абвесці вакол пальца Беларусь і Расію не атрымаецца. «Мы ведаем свае мэты, свае інтарэсы. І ў гэтай сітуацыі, калі аб Зяленскага ногі выцерлі ў Белым доме і ўсюды, яму бы раскінуць мазгамі, сесці і дамовіцца. Ніхто Украіне дапамагаць не будзе», — сказаў Прэзідэнт. Па яго словах, кіраўніцтва Украіны, калі не гэта, дык наступнае, яшчэ вернецца да Беларусі і Расіі і будзе абапірацца на ўнутраныя сілы. «Каму хочацца, каб мы ваявалі адзін супраць аднаго? Мы гэта разумеем, другі бок — не. Таму няхай думаюць», — падсумаваў беларускі лідар.

## «НЕ ЎЛІЧВАЦЬ ІНТАРЭСЫ БЕЛАРУСІ ДЛЯ НАС ШКОДНА»

Адказваючы на пытанне аб уліку інтарэсаў Беларусі пры перагаворах па ўрэгуляванні канфлікту на Украіне, Уладзімір Пуцін пракаментаваў яго наступным чынам:

«Інтарэсы Рэспублікі Беларусь пры нашых узаемаадносінах з кім бы там ні было (з нашымі партнёрамі за акіянам, з найбліжэйшымі нашымі саюзнікамі, суседзямі) улічваюцца заўсёды. Мы ў рамках адзінай Саюзнай дзяржавы зыходзім з таго, што ў нас агульная канцэпцыя знешняй палітычнай дзейнасці».

Расійскі лідар прывёў у прыклад цеснае ўзаемадзеянне на ўсіх міжнародных пляцоўках:

«Мы працуем цесна ў рамках ЕАЭС, у нас вельмі глыбокая кааперацыя ў сферы эканомікі, рэальнай вытворчасці. Таму не ўлічваць узаемныя інтарэсы мы проста не можам. Ды і жадання такога няма. Таму што любы наш крок на любым з гэтых кірункаў так ці інакш адбіваецца і на нас, і на Беларусі. Улічваць інтарэсы Беларусі цалкам адпавядае нацыянальным інтарэсам Расійскай Федэрацыі».

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў:

«Гэта пытанне з'явілася з падачы нашых «збеглых» за мяжой і іх замежных спонсараў, што Расія з Амерыкай дамовіцца, а Лукашэнку туды не пусцяць і інтарэсы Беларусі не будуць улічаны. Прыкладна такі кантэкст».

Кіраўнік дзяржавы адказаў завочным апанентам:

«Па-першае, я асабліва не рвуся нікуды. Па-другое, там будзе блізкі нам чалавек — наш партнёр — **Расійская Федэрацыя, і яна ведае нашы інтарэсы і ні ў якім разе нікому не саступіць і не адступіцца ад нашых інтарэсаў.** Таму, калі хтосьці спадзяецца, што перагаворы па Украіне, Расіі і ЗША ці Расіі і Захаду нанясуць нейкую шкоду суседняй Беларусі (у сувязі — **«Зв.»**) з гэтым канфліктам, абсалютна гэта не так».

Уладзімір Пуцін са свайго боку рэзюмаваў адказ:

«Дадаць няма чаго. Таму што не ўлічваць інтарэсы Беларусі для нас шкодна».

## «Я ЗАДАВОЛЕНЫ ХОДАМ»

Прагучала і пытанне аб ходзе інтэграцыі і аб рэалізацыі 28 саюзных праграм.

Адказваючы на яго, Уладзімір Пуцін растлумачыў:

«Усе 28 праграм, якія былі намечаны, выкананы на 100 %. Тое, што мы планавалі на 2024—2026 гады, выканана больш чым на 26 %. Я асабіста задаволены тым, як ідзе гэта работа. Урад працуе вельмі напружана, інтэнсіўна і рэзультатыўна. Час ад часу нам з Аляксандрам Рыгоравічам даводзіцца браць нейкі ўдзел, каб узгадніць няўзгодненасці паміж рознымі ведамствамі. Але гэта адбываецца ўсё ў рабочым парадку».

Прэзідэнт Беларусі ў сваю чаргу канстатаваў:

«Я асабіста задаволены тым, як ідзе гэта работа. Дадаць нічога не магу».

Ён падзяліўся, што першапачатковая перажываў:

«На нас нагрузка таксама была прыстойная. Але мы дакладна дамовіліся: што ўрады не змогуць выпрацаваць на сваім узроўні — выносіць на наш узровень для ўзгаднення. Сёння было два-тры такія пытанні падчас перагавораў. Мы ўзгаднілі іх, урады працуюць, сумесныя групы і нашы пасольствы. Таму я задаволены гэтым ходам».

# Па выніках перагавораў Прэзідэнты Беларусі і Расіі падпісалі сумесную заяву

У дакуменце адзначаецца, што перагаворы прайшлі ў атмасферы дружбы, узаемаразумення і даверу, кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі шырокі спектр актуальных пытанняў двухбаковага парадку дня і перспектыўныя кірункі далейшага развіцця маштабнага беларуска-расійскага супрацоўніцтва.

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін пацвердзілі саюзніцкі характар адносін паміж Беларуссю і Расіяй і нязменнасць курсу на пашырэнне стратэгічнага партнёрства ва ўсіх сферах. «Беларусь і Расія прадоўжаць паступальна нарошчваць двухбаковае гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва, у тым ліку ўзаемадзеянне ў сферах прамысловай кааперацыі і інфраструктурнага будаўніцтва», — гаворыцца ў сумеснай заяве.

Прэзідэнты заклікалі да далейшага развіцця міжпарламенцкіх і міжпартыйных сувязяў, павышэння ролі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Лідары дзвюх краін падтрымліваюць пашырэнне міжрэгіянальнага і прыгранічнага супрацоўніцтва.

У дакуменце таксама гаворыцца аб важнасці пашырэння гуманітарных сувязяў і супрацоўніцтва, асаблівым значэнні сумесных намаганняў па патрыятычным выхаванні моладзі, а таксама па барацьбе з гераізацыяй нацызму і фальсіфікацыяй гісторыі.

Лідары краін пацвердзілі нацэленасць на паступальнае інтэграцыйнае будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, умацаванне яе эканамічнага і тэхналагічнага патэнцыялу, фарміраванне агульных прастор у сацыяльна-эканамічнай, гуманітарнай, абароннай, міграцыйнай, інфармацыйнай і іншых сферах, выраўноўванне правоў і свабод грамадзян і ўмоў дзейнасці суб'ектаў гаспадарання дзвюх краін.

«Бакі прадоўжаць нарошчваць сумесныя намаганні па эфектыўным рэагаванні на сучасныя выклікі і пагрозы з мэтай умацавання бяспекі Беларусі і Расіі ў рамках агульнай абароннай прасторы Саюзнай дзяржавы», — гаворыцца ў заяве.

Адбыўся абмен граматамі аб ратыфікацыі Дагавора аб гарантыях бяспекі ў рамках Саюзнай дзяржавы, які пасля гэтага набыў сілу.

У сумеснай заяве Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін адзначылі, што новыя ваенна-палітычныя рэаліі ствараюць неабходнасць фарміравання ўстойлівай сістэмы еўразійскай бяспекі, і ў тым ліку заклікалі іншыя краіны падтрымаць ініцыятыву аб распрацоўцы Еўразійскай хартыі разнастайнасці і шматпалярнасці ў XXI стагоддзі. У знешняй палітыцы Беларусь і Расія маюць намер садзейнічаць далейшаму фарміраванню шматпалярнай сістэмы міжнародных адносін, заснаванай на ўзаемнай павазе інтарэсаў і калектыўным вырашэнні міжнародных праблем.

У дакуменце таксама ўдзелена ўвага супрацоўніцтву ў рамках інтэграцыйных структур, гаворыцца аб намаганнях па паглыбленні інтэграцыйных сувязяў і ўзаемадзеянні ў СНД і Еўразійскім эканамічным саюзе. Расія падзяляе і падтрымлівае прыярытэты старшынства Беларусі ў органах ЕАЭС у бягучым годзе.

Кіраўнікі дзяржаў прызнаюць вядучую ролю АДКБ у забеспячэнні рэгіянальнай стабільнасці і падкрэсліваюць нацэленасць на далейшае ўдасканаленне сістэмы калектыўнай бяспекі, у тым ліку ў рамках будучага старшынства Расіі ў АДКБ у 2026 годзе.

Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва Беларусь і Расія разглядаюць як аснову для фарміравання архітэктуры роўнай і непадзельнай бяспекі ў Еўразіі. Краіны маюць намер развіваць супрацоўніцтва ў рамках ШАС у сферах палітыкі, эканомікі і гуманітарных сувязяў.

Кіраўнікі дзяржаў, вітаючы атрыманне Беларуссю ў 2024 годзе статусу дзяржавы — партнёра БРІКС, дамовіліся праводзіць рэгулярны абмен думкамі па пытаннях супрацоўніцтва ў рамках аб'яднання і выбудоўваць сістэмнае ўзаемадзеянне з ім Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнты Беларусі і Расіі захоўваюць прыхільнасць да ідэі гарманізацыі інтэграцыйных працэсаў у рэчышчы ініцыятывы Вялікага еўразійскага партнёрства, уключаючы лібералізацыю гандлёвых адносін, сумеснае развіццё транспартна-лагістычнай інфраструктуры і іншых сфер эканамічнага супрацоўніцтва.

Бакі маюць намер умацоўваць каардынацыю ў органах і структурах ААН, прадаўжаць супрацоўніцтва ў мэтах умацавання міжнароднага рэжыму нераспаўсюджвання ядзернай зброі.

Беларусь і Расія таксама пацвердзілі агульнасць падыходаў да забеспячэння бяспекі інфармацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы і ўмацавання яе тэхналагічнага суверэнітэту ў мэтах развіцця. Бакі зробяць неабходныя захады для найхутчэйшага пачатку работы медыякампаніі Саюзнай дзяржавы.

У сумеснай заяве таксама асуджаецца санкцыйная палітыка ў розных яе формах. Падкрэсліваецца, што аднабаковыя прымусовыя меры, якія прымаюцца ў абыход рэзалюцый Савета Бяспекі ААН, з'яўляюцца незаконнымі.

Прэзідэнты Беларусі і Расіі падпісалі Пагадненне аб мерах па ўзаемнай абароне грамадзян ад неабгрунтаванага пераследу замежнымі дзяржавамі і міжнароднымі органамі юстыцыі. У адпаведнасці з гэтым дагаворам бакі маюць намер сумесна змагацца з негатыўнай тэндэнцыяй палітызацыі сферы міжнароднага прававога супрацоўніцтва па крымінальных справах і садзейнічаць умацаванню агульнапрызнаных норм міжнароднага права, якія датычацца суверэннай роўнасці дзяржаў і імунітэтаў службовых асоб дзяржаў, што вынікаюць з яе.

Бакі маюць намер і ў далейшым каардынаваць пазіцыі адносна дзейнасці НАТА і яе краін-членаў, накіраванай на стварэнне выклікаў і пагроз бяспецы і інтарэсам Беларусі і Расіі. Да найбольш дэстабілізацыйных дзеянняў краін НАТА, якія правакуюць найсур'ёзнейшыя стратэгічныя рызыкі, бакі перш за ўсё адносяць варожыя крокі, якія захоўваюцца ў кантэксце ўкраінскага крызісу, што можа пацягнуць прамы ўзброены канфлікт ядзерных дзяржаў, планы па разгортванні ў Еўропе амерыканскіх ракет сярэдняй і меншай далёкасці наземнага базіравання, нарошчванне супрацьракетных патэнцыялаў, якія фарміруюць і падсілкоўваюць еўрапейскі сегмент глабальнай сістэмы супрацьракетнай абароны ЗША, размяшчэнне ваеннай інфраструктуры і істотных баявых сіл на граніцах Саюзнай дзяржавы, а таксама інтэнсіфікацыю ваеннай дзейнасці ў раёнах судакранання, развіццё схем і патэнцыялаў так званых сумесных ядзерных місій НАТА, якія абапіраюцца на разгортнутую ў Еўропе амерыканскую ядзерную зброю.

Кіраўнікі дзяржаў асудзілі агрэсіўна-канфрантацыйны характар палітыкі Еўрапейскага саюза ў адносінах да Беларусі і Расіі, умяшанне ва ўнутраныя справы, прымяненне аднабаковых санкцый, у тым ліку экстэрытарыяльнага характару, у парушэнне Статута ААН. Падкрэслівацца, што такія меры наносяць шкоду міжнароднаму і ўстойліваму развіццю, а палітычны ціск, які робіцца на трэція краіны праз нелігітымныя санкцыйныя механізмы, недапушчальны.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну за цёплы прыём і запрасіў яго наведаць Беларусь з візітам.

АКТУАЛЬНА

# СТАНОЎЧЫ ПАДЫХОД

## Аляксандр ТУРЧЫН: «Кантрольная дзейнасць не павінна паралізоўваць работу суб'ектаў гаспадарання»

Нарада аб удасканаленні кантрольнай дзейнасці прайшла ўчора ва ўрадзе пад кіраўніцтвам прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына, паведамілі ў прэс-службе Саўміна.

— Мы абмяркуем адно з найважнейшых пытанняў, якое хвалюе, напэўна, усе суб'екты гаспадарання ў нашай краіне без выключэння, — удасканаленне кантрольнай дзейнасці, — адзначыў прэм'ер-міністр.

Ён нагадаў, што заканадаўства ў гэтым кірунку карэктавалася не раз, але яшчэ ёсць над чым працаваць:

— Не павінна быць празмернага ціску на прадпрыемствы ў частцы праверачных мерапрыемстваў, а адказнасць за парушэнне павінна быць суразмерная парушэнню.

Кіраўнік Саўміна перакананы, што кантрольная дзейнасць не павінна паралізоўваць работу суб'ектаў гаспадарання, а штрафныя санкцыі прыводзіць да таго, што прадпрыемства спыняе сваё існаванне.

Аляксандр Турчын падкрэсліў, што змена заканадаўства дазволіць ліквідаваць існуючыя ў ім на дадзены момант прабелы:

— Сёння нам неабходна выпрацаваць адпаведныя механізмы, якія будуць станоўча ўплываць на ўзаемаадносіны кантрольных і наглядных органаў з суб'ектамі гаспадарання.

З НАГОДЫ

# ВЯЛІКАЕ ДАСЯГНЕННЕ — ЖЫЦЬ ПА СВАІХ ЗАКОНАХ

## Урачыстасць, прымеркаваная да Дня Канстытуцыі, сабрала сталічных актывістаў

Падчас мерапрыемства «Асоба. Грамадства. Дзяржава» мінчане, якія прадэманстравалі актыўную пазіцыю падчас электаральнай кампаніі, зрабілі важкі ўнёсак у развіццё не толькі сталіцы, але і дзяржавы, былі ўзнагароджаны Падзячнымі лістамі Прэзідэнта, узнагародамі дзяржаўных органаў.



Віншуючы прысутных з Днём Канстытуцыі, **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** адзначыла, што Асноўны Закон увабраў у сябе ўсе славутыя этапы развіцця нашай краіны. «Гісторыю, духоўнасць, маральнасць, захаванне нашых традыцый, — канкрэтызавала спікер. — І сёння наша дзяржава прававая і жыве па законах нашай краіны. Прытрымліваючыся строгага выканання Асноўнага Закона нашай краіны, мы сёння жывём у суверэннай і незалежнай Беларусі — дзяржаве для народа. Гэта вялікае дасягненне нашай краіны».

Па словах Наталлі Качанавай, у гэтым складаным свеце, які вельмі хутка мяняецца, грамадзяне Беларусі павінны дакладна разумець, што ад кожнага з нас залежыць будучыня нашай краіны, нашага народа.

Спікер звярнула ўвагу на тое, што ў зале прысутнічаюць людзі, якія кожны дзень сваёй працай уносяць важкі ўклад ва ўмацаванне эканамічнай магутнасці сталіцы, у цэлым рэспублікі. Тыя, хто праяўляе грамадзянскую пазіцыю ў адносінах да сваёй краіны і робіць усё для таго, каб у ёй панавалі мір і спакой.

«Па выніках 2024 года горад Мінск прызнаны найлепшым у выкананні прагнозна-эканамічных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, — адзначыла Наталля Качанава. — Рэалізаваны ў Год якасці вельмі знакавыя праекты, якія, несумненна, годна ацэнены жыхарамі сталіцы: на артэзіянскую ваду пераведзены ўсе раёны горада, уведзены новыя станцыі метрапалітэна, пабудаваны інтэрнат для нашых студэнтаў, уведзены карпусы бальніц і многія іншыя аб'екты. Усе тыя задачы, якія ставіць перад намі Прэзідэнт, выконваюцца з гонарам і годнасцю».

Спікер нагадала: сёлета адбылася найважнейшая палітычная падзея — выбары кіраўніка дзяржавы. «Народ праявіў адзінства ў падтрымцы той палітыкі, якая праводзіцца ў нашай краіне», — падкрэсліла яна.



Як звярнуў увагу **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ,** беларусам ёсць чым ганарыцца. «Наша Канстытуцыя — адна з самых сучасных, пятая па ліку, пачынаючы з 1919 года, — канстатаваў ён. — Нядаўна ў яе былі ўключаны новыя артыкулы: напрыклад, 89-ы (аб Усебеларускім народным сходзе). Гэта азначае, што наша краіна жыве, заканадаўства мяняецца і адказвае тым пасылам, якія яму накіроўвае наша цывілізаванае грамадства, людзі, якія хочуць жыць у сваёй краіне і па сваіх законах».

Уладзімір Пярцоў выказаў удзячнасць прысутным за тое, што галоўны іспыт пяцігодкі — выбары Прэзідэнта — здадзены паспяхова. «З годным вынікам, спакойна, без хваляванняў і ўзрушэнняў, на злосць усім нашым ворагам, — канкрэтызаваў ён. — У гэтым вялізная, каласальная работа, якая была не толькі ў электаральны перыяд, але і на працягу ўсіх пяці папярэдніх гадоў».

Як акцэнтаваў увагу ў размове з журналістамі **старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА,** беларуская дзяржаўнасць прайшла дастаткова працяглы шлях у гістарычным развіцці. «І, вядома, сёння Канстытуцыя з'яўляецца магутным фундаментам, які забяспечвае суверэнітэт і незалежнасць нашай Рэспублікі Беларусь як дзяржавы, якая на працягу ўжо больш як 30 гадоў пасля прыняцця першай Канстытуцыі выбудавала сваю знешнюю, унутраную палітыку, атрымала прызнанне на міжнароднай арэне, праводзіць сацыяльна арыентаваную палітыку», — канстатаваў ён.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота БелТА.**

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ АКЦЫЯ

# «СТАЦЬ ГРАМАДЗЯНІНАМ НАШАЙ КРАІНЫ — ГЭТА ЗНАКАВА»

## Ігар СЕРГЯЕНКА ўручыў пашпарты таленавітай моладзі

Аднак перш чым атрымаць галоўны дакумент краіны, школьнікі з розных рэгіёнаў азнаёміліся з гісторыяй станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Для хлопцаў і дзяўчат, а таксама іх бацькоў, дэпутатаў і гасцей Палаты прадстаўнікоў у фае Авальнай залы арганізавалі выстаўку «Асноўны Закон дзяржавы», прымеркаваную да Дня Канстытуцыі.



Фота БелТА.

Юныя беларусы атрымалі магчымасць дакрануцца да ўнікальных выданняў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі, якія характарызуюць асноўныя этапы заканадаўчай дзейнасці ў нашай краіне. Сярод іх — арыгінал Статута ВКЛ 1588 года, звод законаў Расійскай імперыі канца XVIII стагоддзя, Канстытуцыя ўзору 1927 года, напісаная на чатырох мовах. Асноўныя тагачасныя канстытуцыйныя палажэнні зафіксавалі і мастакі — аб гэтым сведчыць серыя плакатаў, прадстаўленая на выстаўцы.

Прызёры алімпіяд, лаўрэаты творчых конкурсаў і спартыўных спаборніцтваў непасрэдна з вуснаў дэпутатаў даведаліся пра гісторыю Дома ўрада; пра тое, як прымаюцца сучасныя законы. Асобная старонка, якой ганарыцца цяперашняе пакаленне заканадаўцаў, — подзвіг дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР першага склікання ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 94 з іх не вярнуліся з фронту, аднак памяць аб іх захоўваецца — прозвішчы гэтых мужных людзей увекавечаны ў мемарыяльнай дошцы пры ўваходзе ў Авальную залу.

Звяртаючыся да юных грамадзян, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка адзначыў, што ў сценах Дома ўрада, будучы дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, пачынаў сваю палітычную біяграфію Аляксандр Лукашэнка. Менавіта ў Авальнай зале Прэзідэнт нашай краіны прымаў сваю першую прысягу, а 15 сакавіка 1994 года дэпутаты галасавалі за першую Канстытуцыю суверэннай Беларусі.

«Асноўны Закон нашай краіны ўвасабляе ў сабе ўсё наша мінулае (і тыя гістарычныя традыцыі, і нашы духоўныя каштоўнасці), фарміруе прававыя асновы функцыянавання і развіцця нашай дзяржавы, — падкрэсліў спікер. — Фактычна на падставе Канстытуцыі фарміруецца ўся заканадаўчая база па шматлікіх кірунках дзейнасці, прымаюцца законы, па якіх жыве наша краіна, функцыянуе народная гаспадарка, законы, па якіх жывуць людзі».

Па словах Ігара Сергяенкі, пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь — адзін з асноўных дакументаў, які адкрывае для маладых людзей дарогу ў дарослае жыццё. «Хацелася б, каб вы ўпэўнена ішлі па жыцці, станавіліся сапраўднымі патрыётамі, грамадзянамі нашай краіны, — звяртаючыся да хлопцаў і дзяўчат, сказаў ён. — Быць грамадзянінам — гэта не толькі мноства правоў, але гэта мноства маса абавязкаў, пачынаючы з выканання Канстытуцыі і павагі да нашых сімвалаў — герба, гімна і сцяга».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў пажадаў таленавітай моладзі ўпэўненага руху наперад, авалодвання ведамі, пашаны да сваёй гісторыі, павагі да родных. «Менавіта з адносін да малой радзімы фарміруюцца і адносіны ў цэлым да краіны, нашай Рэспублікі Беларусь, — падкрэсліў спікер. — Жыць і працаваць па сённяшніх законах і тых законах, якія будуць прымацца далей, — вам».

Пасля цырымоніі ўручэння пашпартоў удзельнікаў і гасцей урачыстасці чакала святочная праграма — у такім фармаце Усебеларуская акцыя «Мы — грамадзяне Беларусі!», прымеркаваная да Дня Канстытуцыі, у Палацы прадстаўнікоў прайшла ўпершыню.

Як патлумачыў у размове з журналістамі Ігар Сергяенка, гэта было зроблена для таго, каб сённяшні дзень хлопцам і дзяўчатам запомніўся. «Атрыманне пашпарта — не шараговая падзея, — канстатаваў ён. — Стаць грамадзянінам нашай краіны — гэта знакава». Па яго словах, пашпарты ў Авальнай зале атрымалі найлепшыя прадстаўнікі сённяшняй моладзі, якім заўтра выбіраць прафесію, паслязаўтра — працягваць тую справу, якой займаюцца бацькі, развіваць нашу эканоміку, рухаць краіну далей.

**Вераніка КАНЮТА.**

### Дарэчы

20 сакавіка Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка здзейсніць рабочую паездку ў Віцебскую вобласць. Ён правядзе асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Пастаўскім раённым выканаўчым камітэце, паведамілі ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
по продаже недвижимого имущества
ОАО «Витязь»
Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов
**№ 2025.Ч.002.00063**
по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витязь», 210605, Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, тел. +375 212 26-55-08.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12; +375 (29) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru; **https://etpvit.by.**

**Дата и время проведения торгов: 15.04.2025 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**Лот № 1.** Нежилое помещение – магазин 1 с кадастровым номером 67:27:0014550:68, площадью 189,4 кв. м, назначение – нежилое, по адресу: Российская Федерация, Смоленская обл., г. Смоленск, просп. Гагарина, д. 48.

**Нач. цена: 478 000,00** бел. руб. без учета НДС.
**Задаток: 47 800,00** бел. руб.

Обременение: договор аренды № 947д от 29.07.2021 действует по 30.07.2027.

Электронные торги проводятся в соответствии Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» etpvit.by.

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 14.04.2025 по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY.**

**Сумма задатка перечисляется Оператору электронных торгов, получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга»: в белорусских рублях**: р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, IBAN MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901; **в российских рублях:** ЗАО «МТБанк» JSC «MTBank», SWIFT: MTBKBY22, address: 6-a, Partizansky Av., 220033, Minsk, Republic of Belarus, Номер счета/Correspondent Account: 30111810300002054666 в RUB\Банк-корреспондент/Correspondent bank: КБ «Москоммерцбанк» (АО) Россия, 119017, Москва, ул. М. Ордынка, д. 20, стр. 1, БИК 044525951, корсчет: 30101810045250000951 в ГУ Банка России по Центральному федеральному округу г. Москва, для зачисления на счет BY48MTBK30120001064300050439 для ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов:** Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения эл. торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, расходы Продавца на проведение независимой оценки предмета эл. торгов, оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи; в случае недостижения согласия между Продавцом и Покупателем по срокам оплаты предмета эл. торгов, предмет эл. торгов оплачивается в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. НДС от цены продажи предмета эл. торгов уплачивается сверх стоимости предмета эл. торгов. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее, чем за день до наступления даты их проведения.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (212) 265383.

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Белинвестбанк»** (Продавец) на праве собственности.

**Электронные торги состоятся 16 апреля 2025 г. в 11.00**

**Лот № 1:**
Изолированное помещение № 549
с инв. № 600/D-64448, площадь 17,0 кв. м.

Начальная цена с НДС 20 % – 7 449,67,00 белорусских рублей.
Задаток – 744,96 белорусских рублей.

**Адрес:** Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Озерцо, Менковский тракт, 2-549.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Срок для заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения и затрат на организацию и проведение электронных торгов Организатору электронных торгов).

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **11 апреля 2025 г. в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52;**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

# «НАС УСІХ ТУТ САБРАЛА ЛЮБОЎ ДА КНІГІ»

## На XXXII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы адкрыўся Міжнародны квартал

Цырымонія адкрыцця Міжнароднага квартала на палях XXXII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу — адно з першых маштабных мерапрыемстваў у рамках беларускага старшынства ў органах ЕАЭС. Яго мэта — даць магчымасць акрэдытаваным у нашай краіне дыпламатычным місіям, замежным кнігавыдаўцам і аўтарам шырока прадставіць літаратурныя дасягненні сваіх краін.



Вялікі кніжны форум працягвае вабіць на пляцоўкі ўсё большую колькасць гасцей і наведвальнікаў, падкрэсліў **першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Андрэй КУНЦЭВІЧ**: «Толькі за першы дзень работы праз выставачны цэнтр на праспекце Пераможцаў прайшло больш за 11 тысяч чалавек — небывалая дагэтуль лічба».

Разам з партнёрамі і пры актыўным удзеле дыпламатычных місій ужо не першы год на выстаўцы арганізоўваецца работа Міжнароднага квартала. Сёлета, паводле слоў спікера, на яго пляцоўках прадстаўлены кнігі з 21 краіны. А ўсяго за гады правядзення ў мінскім кніжным форуме ўзялі ўдзел пісьменнікі, кнігавыдаўцы з больш чым 60 дзяржаў, што робіць выстаўку значнай падзеяй як у самой Беларусі, так і за яе межамі.

Варта адзначыць, што геаграфія Міжнароднага квартала з кожным годам пашыраецца. Сёлета тут прадстаўлены дзяржавы СНД, Лацінскай Амерыкі, Азіі, Блізкага Усходу. Андрэй Кунцэвіч выказаў упэўненасць, што кожны, хто зазірне ў кніжны квартал, знойдзе нешта цікавае для сябе.

Сёлета лейтматывам усёй выстаўкі-кірмашу з'яўляецца знакавая дата — 80-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. «Гэта важная тэма, якая жыве ў нашых сэрцах і аказвае істотны ўплыў на ўсіх нас, — адзначыў **намеснік міністра замежных спраў Беларусі Павел УЦЮПІН.** — Вялікая Перамога — так яе называюць на постсавецкай прасторы — гэта гісторыя неверагоднага подзвігу і гераічнай самаахвярнасці на карысць лепшай будучыні ўсяго чалавецтва. Гэту неад'емную і найкаштоўнейшую частку нашай агульнай гісторыі дзесьці на Захадзе сёння спрабуюць перапісаць, забыць, перайначыць. І каб супрацьстаяць гэтым спробам, важна не толькі захаваць гістарычную памяць, але і перадаваць яе з пакалення ў пакаленне. Упэўнены, што адным з найлепшых спосабаў гэтай перадачы з'яўляецца добрая кніга пра тыя падзеі», — адзначыў выступоўца.

Прынята лічыць, дадаў ён, што людзі ўсё радзей карыстаюцца кнігамі, аднак беларусы абвяргаюць гэты факт: «Паводле сацыялагічных даследаванняў, 70 % грамадзян нашай краіны некалькі разоў на тыдзень бяруць у рукі кнігу. Нягледзячы на шырокае распаўсюджванне электронных кніг, большасць — каля 80 % — аддаюць перавагу менавіта папяровым выданням». Гэта тлумачыць, чаму Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш ужо больш чым 30 гадоў карыстаецца такой папулярнасцю.





На адкрыцці Міжнароднага квартала былі афіцыйныя прадстаўнікі дзяржаў — членаў ЕАЭС.

«Нас усіх тут сабрала любоў да кнігі, — сказаў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь Цімур ЖАКСЫЛЫКАЎ.** — Нягледзячы на тое, што мы жывём у век лічбавых тэхналогій, глабалізацыі, кніга па-ранейшаму застаецца галоўнай крыніцай ведаў і сродкам перадачы культуры, захавання гістарычнай памяці».

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

## У тэму

Жыццё на выстаўцы-кірмашы віруе літаральна кожную гадзіну. Учора сярод шматлікіх прэзентацый было нямала і цікавых «звяздоўскіх»: наша калега Валерыя Сцяцко прадстаўляла сваю кнігу пра вядомых спартсменаў «Па той бок медаля», а дзіцячая пісьменніца Кацярына Хадасевіч-Лісавая, чые кнігі выходзяць у Выдавецкім доме «Звязда», зладзіла на нашым стэндзе чарговую казачную гісторыю для сваіх маленькіх чытачоў.



Таксама на палях кніжнага форуму падчас круглых сталоў спецыялісты выдавецкай справы абмеркавалі тэмы выдання сацыяльна значнай літаратуры і яе выкарыстання ў школьнай праграме.

Наперадзе яшчэ шмат цікавага — выстаўка-кірмаш будзе працаваць у выхадныя. Прыходзьце на яе разам з дзецьмі і не забудзьцеся зазірнуць на пляцоўку Выдавецкага дома «Звязда»: у нас шмат добрых кніг, ёсць магчымасць сустрэцца з іх аўтарамі і нават, калі пашанцуе, атрымаць падарунак.

# СУМОЎІ ДЛЯ ІНЖЫНЕРАЎ І ЭЛЕКТРОННАЯ ЧАРГА ДЛЯ ЎСІХ

## ПРА ТЭРМІНЫ

— У гэтым годзе, як і ў мінулым, цэнтралізаваныя экзамены і тэсціраванне будуць праходзіць у адзіныя тэрміны, — расказаў кіраўнік галоўнага ўпраўлення. — Цэнтралізаваны экзамен выпускнікі нашых школ здаюць 26 і 29 мая, сертыфікаты па выніках здачы ЦЭ абітурыенты выкарыстоўваюць для паступлення ва ўстанову вышэйшай адукацыі. Адразу ж пасля іспытаў на цэнтралізаваным тэсціраванні можна здаць дадатковыя навучальныя прадметы. Далейшы шлях — у прыёмную камісію.


Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Прыём мэтавікоў, па словах кіраўніка галоўнага ўпраўлення, будзе вынесены за рамкі асноўнага. То-бок спачатку пройдзе ўступная кампанія дл тых, хто заключыў дагаворы аб мэтавай падрыхтоўцы, а потым пачнецца прыём дакументаў на агульных падставах.**

## АБ ПЕРАЗДАЧЫ

Адно з найбольш значных нававядзенняў гэтага года — тое, што выпускнікам школ, якія не здалі цэнтралізаваны экзамен, дазволяць яго пераздаць.

— Паўторна ЦЭ можна будзе здаць у жніўні. Шанц паступіць у ВНУ ў цяперашнюю ўступную кампанію, зразумела, будзе прапушчаны — да таго часу ўступная кампанія завершыцца. Аднак разам з тым у абітурыентаў будзе магчымасць падаць дакументы ў каледж і атрымаць запатрабаваную спецыяльнасць.




(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## ТОЛЬКІ ПА СУМОЎІ

Сёлета ў школах краіны адбудзецца першы выпуск інжынерных класаў. Адкрыўся гэты кірунак у 2023 годзе, і вось ужо каля дзвюх з паловай тысячы выпускнікоў інжынерных класаў рыхтуюцца паступіць у ВНУ на шэраг інжынерных спецыяльнасцяў.

— Для такіх абітурыентаў прадугледжана магчымасць паступлення без уступных выпрабаванняў, па сумоўі, — кажа прадстаўнік Мінадукацыі. — Але ёсць важная ўмова — у іх атэстаце адзнакі па профільных прадметах павінны быць не ніжэй за 8 балаў, а па ўсіх астатніх — не ніжэй за 7. Спецыяльнасці ўжо зацверджаны, а пытанні для сумоўя размешчаны на сайтах ВНУ.

## У ТОПЕ

Якія спецыяльнасці найбольш папулярныя ў абітурыентаў? Калі меркаваць па мінулым годзе, то гэта медыцынскія, інжынерныя і педагагічныя.

— Такая тэндэнцыя захоўваецца і ў цяперашнюю ўступную кампанію, — дзеліцца Сяргей Пішчоў. — Гэта пацвярджаецца і планамі прыёму, якія да 1 красавіка будуць размешчаны на інфармацыйных рэсурсах ВНУ.

Расказаў кіраўнік галоўнага ўпраўлення і аб новых спецыяльнасцях, якія будуць адкрыты ў 2025-м.

— На базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта адкрыта новая спецыяльнасць «Інтэлектуальная электроніка», у Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце — «Праектаванне і тэхналогія беспілотных авіяцыйных комплексаў». Абітурыенты змогуць выбраць і спецыяльнасць «Фізічная культура. Ваенна-патрыятычнае выхаванне», якая адкрыта ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. А. Куляшова. Усе спецыяльнасці забяспечаны заяўкамі ад арганізацый — заказчыкаў кадраў.

## БЕЗ МІТУСНІ І ЧЭРГАЎ

З гэтага года дакументы ў прыёмную камісію можна будзе падаць, скарыстаўшыся паслугай электроннай чаргі.

— Цяпер сэрвіс дасутпны ў пілотным рэжыме для выпускнікоў, якія здалі рэпетыцыйны ЦЭ, у іх асабістых кабінетах на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. У поўным аб'ёме сэрвіс запрацуе для ўсіх абітурыентаў за некалькі дзён да пачатку прыёму дакументаў у ВНУ. Пры гэтым скарыстацца ім змогуць удзельнікі ЦЭ і ЦТ як гэтага, так і мінулага года.

**«У кругласутачным рэжыме маладыя людзі змогуць выбраць па жаданні любыя тры ВНУ, факультэты і спецыяльнасці, куды плануюць падаць дакументы, — растлумачыў Сяргей Пішчоў.**

— Пацвярджэннем выбару будзе талон з назвамі ВНУ, спецыяльнасцю, датай і часам падачы дакументаў, які абітурыент заўсёды зможа загрузіць у сваім асабістым кабінеце на сайце РІКВ.

Кіраўнік галоўнага ўпраўлення расказаў, што пасля рэгістрацыі неабходная інфармацыя будзе накіравана таксама і ў выбраную абітурыентам ВНУ.

— На падставе гэтай інфармацыі прыёмная камісія будзе планаваць сваю работу і ў выпадку неабходнасці будзе прыцягваць на прыём дакументаў дадатковыя сілы, каб скараціць час на падачу дакументаў, — падсумаваў ён.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**


## ИНФОРМАЦИЯ
о проведении повторного аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **Открытое акционерное общество «Солигорскторг», г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44** |
| Дата, время и место проведения аукциона | **26.03.2025, 12.00, актовый зал ОАО «Солигорскторг»** |
| Предмет аукциона | **Право заключения договора аренды недвижимого имущества – капитального строения с инвентарным номером 644/С-2769** |
| Общая площадь, кв. м | 1 086,2 |
| Местонахождение недвижимого имущества | Минская область, г. Солигорск, ул. Ленинского Комсомола, 22 |
| Характеристика недвижимого имущества и иные сведения | Оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроснабжением, канализацией, охранной сигнализацией, имеются складские помещения, подъездные пути |
| Условия аукциона | Целевое использование имущества – организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения офиса, детских развлекательных аттракционов, оказания услуг (за исключением ритуальных), розничной торговли непродовольственными товарами; за исключением размещения объектов общественного питания, игорных заведений и аптек |
| Начальная цена права заключения договора аренды объекта, руб. | 1 446,82 |
| Сумма задатка, руб. | 1 446,82 |
| Срок договора аренды | 5 лет |
| Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы, устанавливаемый арендодателем | 3 (три) |

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44, финансовый отдел, с 8.00 до 16.00 по рабочим дням **до 25 марта 2025 г. включительно,** телефоны: 8 (0174) 26 07 31, 23 65 26.
Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by (https://au.nca.by),** Солигорского районного исполнительного комитета – **www.soligorsk.gov.by** (Главная/Экономика и бизнес/Инвестору/Аукционы), открытого акционерного общества «Солигорскторг» – **www.soligorsktorg.by** (Главная/Аукционы)



## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов **в дер. Заречье, дер. Ляды, дер. Старина** Драчковского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Место, дата и время проведения аукциона и подведения итогов | **аг. Драчково, ул. Центральная, д. 19В. Помещение Драчковского сельисполкома, 24.04.2025 г. в 11.00** |
| 3 | Продавец и его адрес | аг. Драчково, ул. Центральная, д. 19В, Драчковский сельский исполнительный комитет |
| 4 | Организатор аукциона | Драчковский сельский исполнительный комитет |
| 5 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот № 1** – площадь 0,1691 га, кадастровый номер 624880802901000225, дер. Заречье, ул. Зареченская, 8В. **Лот № 2** – площадь 0,1282 га, кадастровый номер 624880803601000481, дер. Ляды. **Лот № 3** – площадь 0,15 га, кадастровый номер 624880807101000085, дер. Старина, ул. Центральная, 34 |
| 6 | Вид права, целевое назначение земельного участка | Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земель для размещения объектов усадебной застройки) |
| 7 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 – 22000 рублей. Лот № 2 – 7000 рублей. Лот № 3 – 6000 рублей |

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by,** Минского областного исполнительного комитета **www.minsk-region.gov.by,** Смолевичского районного исполнительного комитета **https://isp@smolevichi.gov.by/**



## ИЗВЕЩЕНИЕ
акционеров открытого акционерного общества **«Минсктелекомстрой»** об изменении даты составления списка лиц, имеющих право на участие в очередном общем (годовом) собрании акционеров

***Уважаемые акционеры!***

Открытое акционерное общество «Минсктелекомстрой» (далее – Общество) (место нахождения: г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1) извещает своих акционеров об изменении даты составления списка лиц, имеющих право на участие в очередном общем (годовом) собрании акционеров, назначенному на 21 марта 2025 г.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в очередном общем (годовом) собрании акционеров ОАО «Минсктелекомстрой» – 14 марта 2025 г.

Основание: решение наблюдательного совета Общества от 11 марта 2025 г. (протокол № 97).

УНП 100068131

**СЕМЕЙНАЯ ПСИХОЛОГИЯ,**
**сохранения отношений в паре в семье, работа с зависимостями,** и многое другое.
Открываю вам дорогу на счастье, на любовь, на семью.
**Ваш психолог Тамара.** Тел. 8 (029) **3477306**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: **www.torgi24.by** |
| **Продавец** | ООО «ААА Солюшенс», УНП 19297125, г. Минск, ул. Бабушкина, 4а, комн. 38 |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена без НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| 1042 | Дебиторская задолженность ООО «ААА Солюшенс» (с полным списком дебиторов, можно ознакомиться на торговой площадке: www.torgi24.by) | **26 072 035,80** |

**расположенный по адресу:** г. Минск, ул. Бабушкина, 4а, комн. 38

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов (участников)

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту – **не более 5 000,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов: 28.03.2025** в 11.00.
**Дата и время окончания торгов: 28.03.2025** в 16.00

Для участия в торгах необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке: **www.torgi24.by.**
Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by.**
Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 14.03.2025 по 26.03.2025,** с 9.00 до 17.00

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.**
**E-mail: info@torgi24.by**




(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# ВОЗІМ ХУТКА, ЯКАСНА, БЯСПЕЧНА!

Так, транспарт стаў настолькі звыклым і неабходным у нашым паўсядзённым жыцці, што ўявіць сучасную рэальнасць без яго немагчыма. Ды і не трэба — на варце паўнавартаснага яго функцыянавання стаіць дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс», аб рабоце якога распавядае **генеральны дырэктар Алег ДЗЮБЕНКА.**

## КАМФОРТНА, ДАСТУПНА, ЭСТЭТЫЧНА

— «Мінсктранс — буйное і шматкампанентнае прадпрыемства з колькасцю працоўных 9 тысяч чалавек, — расказвае Алег Анатольевіч. — А перад яго калектывам стаіць агульная галоўная задача — ажыццяўляць перавозку пасажыраў якасна і бяспечна: забіраць іх з сучасных тэхналагічных прыпынкаў і перавозіць у камфартабельным транспарце. Камфортнасць, даступнасць, сучаснасць, эстэтычнасць і бяспека — сучасныя адметныя рысы рухомага складу «Мінсктранса». На сталічных вуліцах мы эксплуатуем больш за 2000 адзінак пасажырскай тэхнікі. І ў гэтай колькасці прырастае доля электрыфікаваных транспартных сродкаў. Сёння яна складае больш за 40 %. З асаблівым гонарам хачу адзначыць, што ўвесь транспарт, які працуе на вуліцах сталіцы Беларусі, — айчыннай вытворчасці, ён адпавядае сусветным стандартам якасці, надзейны і эрганамічны.

***— Як зарэкамендавалі сябе электробусы?***

— Іх у нашым парку — больш за 100 адзінак. Пакуль казаць пра нейкі агульны вынік рана. Але тое, што яны паўнавартасна занялі сваю нішу ў працэсе перавозак, — факт. Паступова наладжваем і пашыраем інфраструктуру для іх абслугоўвання. У прыватнасці, для зарадкі электробусаў у Мінску ўжо працуе 21 зарадная станцыя. Шаснаццаць станцый для хуткай зарадкі сілкуюць электробусы з дапамогай пантографаў на канчатковых прыпыначных пунктах, пяць станцый прызначаны для начной зарадкі з выкарыстаннем разетак CCS 2 combo.

***— Раскажыце аб далейшых перспектывах у абнаўленні рухомага складу сталічнага аўтамабільнага і электрычнага транспарту?***

— Для нас і ў гэтай справе асноўнымі крытэрыямі з'яўляюцца павышэнне якасці і бяспека рэгулярных пасажырскіх перавозак, што ў сучасных умовах азначае эксплуатацыю тэхналагічных, камфартабельных, экалагічных транспартных сродкаў. Таму ў планах абнаўлення — збалансаванае развіццё з пастаянным павышэннем долі электрыфікаванага транспарту. Доля адаптаванага да перавозак маламабільных пасажыраў нізкападлогавага транспарту ў нас больш за 90 %. Пры абнаўлен-ні рухомага складу гэта ўмова абавязковая.



Кіроўца тралейбуса Артур ГАНЧАРЫК.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## У РЭЖЫМЕ РЭАЛЬНАГА ЧАСУ

***— Колькі сэрвісаў для зручнасці пасажыраў на сталічным транспарце ўжо дзейнічаюць і якія яшчэ плануецца ўвесці?***

— Ужо звыклымі для ўсіх сталі інфармацыйныя табло на прыпыначных пунктах, зручнасць якіх у поўнай меры ацанілі жыхары і госці сталіцы. На афіцыйным сайце прадпрыемства працуе сэрвіс «Віртуальнае табло», які дазваляе адсочваць месцазнаходжанне гарадскога наземнага транспарту ў рэальным часе з камп'ютараў і смартфонаў. З дапамогай сэрвісу «Рацыянальны маршрут» у пасажыраў маецца магчымасць хутка выбіраць аптымальны маршрут ад пачатковага да канцавога пункта. Для атрымання інфармацыі пра час да прыбыцця грамадскага транспарту на прыпыначны пункт таксама можна скарыстацца паслугай з мабільнага тэлефона з дапамогай USSD-запыту, які ўключае код прыпыначнага пункта. Даведацца час да прыбыцця транспарту, які праходзіць праз прыпыначны пункт, можна, адсканіраваўшы мабільным тэлефонам інфармацыйную таблічку з QR-кодам. Больш як 1000 адзінак пасажырскай тэхнікі прадпрыемства аснашчаны сістэмай «Электронны гід», якая перадае пасажырам візуальную інфармацыю аб маршруце руху і іншыя карысныя звесткі.

## АПЛАЧВАЕМ ПРАЕЗД!

***— Што вы скажаце наконт зручнасці аплаты праезду ў аўтобусах, тралейбусах, трамваях?***

— Сёння аплаціць праезд у грамадскім транспарце можна рознымі спосабамі: укаранёна аўтаматызаваная сістэма аплаты і кантролю праезду. У салонах транспартных сродкаў устаноўлены валідатары для счытвання інфармацыі з бескантактавых смарт-карт і электронныя кампосцеры. Пасажыры могуць самастойна папоўніць баланс бескантактавай смарт-карты ў сістэме «Разлік» (АРІП), набыць электронны білет і аплаціць праезд праз мабільны дадатак «Аплаці». Адзіны праязны дакумент на ўсе віды гарадскога пасажырскага транспарту быў укаранёны таксама для зручнасці пасажыраў, што дазваляе павысіць мабільнасць жыхароў і гасцей сталіцы, скараціць час паездкі, не прывязвацца да пэўнага віду транспарту і сэканоміць асабісты бюджэт.

## ДАВЕРАНА ПРАФЕСІЯНАЛАМ

***— Мы высветлілі, які транспарт возіць сёння мінчан. Застаецца пытанне — хто ім кіруе?***

— З 9000 чалавек, якія працуюць на прадпрыемстве, больш як чатыры тысячы — кіроўцы. З гэтых чатырох тысяч 40 % — прафесіяналы першага класа, каля 25 % маюць другі кваліфікацыйны клас. Патрабаванні да кіроўцаў, якіх бяром на працу, высокія. Таму што высокая і адказнасць. Сярэдняя заработная плата таксама дастойная і складае 4000 рублёў. Калі да нас хоча ўладкавацца чалавек, які не мае адпаведных прафесіі і кваліфікацыі, накіроўваем яго на вучобу. І, пакуль ён вучыцца, выплачваем заработную плату ў памеры 1000 рублёў у месяц.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**



Трамвай Т811 адрозніваецца незвычайнай формай пярэдняй і задняй масак, дзякуючы якой, у выпадку калі пешаход трапіць пад транспарт, які рухаецца, яго не зацягне пад колы, а адкіне ўбок. У трамвай лёгка ўвайсці, таму што падлога па ўсім перыметры салона роўная, адсутнічаюць нязручныя прыступкі. У прасторным вагоне 35 месцаў для сядзення, ёсць спецыяльная пляцоўка, якая дазваляе размясціцца маламабільным пасажырам, паставіць дзіцячую каляску або габарытны груз.



Новы тралейбус МАЗ-303Т пабудаваны на базе нізкападлогавага аўтобуса 303-й мадэлі. У тралейбусным варыянце, у адрозненне ад аўтобуса і электробуса, няма вытыркнутай у салон шахты маторнага адсека, што дазволіла павялічыць колькасць месцаў да 82, з іх 30 — сядзячых, уключаючы 14 на нізкай падлозе. МАЗ-303Т — тралейбус з аўтаномным ходам і можа працаваць на маршрутах з участкамі без кантактнай сеткі.



Сучлянены электробус «Вітаўт» мае пасажыраўмяшчальнасць 144 чалавекі, у салоне прадугледжана 36 месцаў для сядзення. Ёсць назапашвальныя пляцоўкі з месцам, арганізаваным для размяшчэння маламабільных пасажыраў у крэслах-калясках. Транспарт абсталяваны сістэмай відэаназірання і USB-раздымамі. Аўтаномны ход забяспечвае сістэма назапашвальнікаў электраэнергіі на базе суперкандэнсатараў. Час зарадкі ад 30 % займае да 15 хвілін, запас ходу — да 15 км.

ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

# ПАЎТАРА МІЛЬЁНА КВЕТАК ДЛЯ СТАЛІЦЫ

## Чым упрыгожаць вуліцы і двары Беларусі?



**У рамках работ па правядзенні Года добраўпарадкавання прадугледжана рэалізацыя 47 мерапрыемстваў і створаны рэспубліканскі штаб, расказала намеснік начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Людміла БАРТАШЭВІЧ. Пасаджэнні будуць праводзіць не радзей чым раз у квартал.**

У спіс задач на гэты год унесена лесааднаўленне на пашкоджаных участках буралломных насаджэнняў на тэрыторыі звыш шасці тысяч гектараў.

Акрамя таго, запланаваны стварэнне 98 экалагічных сцежак і рэкультывацыя 105 адпрацаваных кар'ераў.

Адзін з першых пунктаў плана — азеляненне населеных пунктаў.

У Беларусі высадзяць да 400 тысяч дрэў і каля 500 тысяч кустоў, звыш 30 мільёнаў кветак, уладкуюць газоны на тэрыторыі, якая перавышае 441 гектар. Для параўнання летась у краіне правялі пасадку каля 348 тысяч дрэў і высадзілі больш за 20 мільёнаў кветак.

З пачатку года стартавала работа па правядзенні працэдур закупкі паслуг па апрацоўцы месцаў росту інвазійных раслін. Работы пачнуць у маі.

## РАМОНТ ВЫКОНВАЦЬ ТРЭБА КОМПЛЕКСНА

У дзяржаўнай праграме «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» добраўпарадкаванню адводзіцца асобная падпраграма. Згодна з ёй, рамонт і рэканструкцыя прыдамавых тэрыторый шматкватэрных жылых дамоў вядуцца штогод па 2 % ад агульнай колькасці ўсёй плошчы, адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Надзея СЕЎРУК.**

У мінулым годзе выкананы рамонт 1792 прыдамавых тэрыторый шматкватэрных жылых дамоў (111,6 % ад плана). Сёлета ў нашай краіне запланаваны рамонт з рэканструкцыяй ужо 1800 дваровых тэрыторый. Асноўны акцэнт гэтых работ — на комплекснасць пры абнаўленні добраўпарадкавання. У рамках такіх комплексных работ на прыдамавых тэрыторыях выконваецца рамонт праездаў, пешаходных сувязяў, замена спартыўнага і гульнявога дзіцячага абсталявання, малых архітэктурных формаў і іншыя.

Сёлета запланаваны бягучы рамонт больш за 870 тысяч квадратных метраў дарожнага палатна праездаў і звыш 200 тысяч квадратных метраў пешаходных сувязяў, будзе ўстаноўлена больш за 22,5 тысячы аб'ектаў знешняга добраўпарадкавання.

## РУЧАІ, АЗЁРЫ І КРЫНІЦЫ

Рэспубліканскі план мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі ўключае ў тым ліку санітарную ачыстку вадаёмаў і вадацёкаў ад цвёрдых адходаў і іншародных элементаў, адзначыла **начальнік аддзела выкарыстання водных рэсурсаў Мінпрыроды Вікторыя ВОРАНАВА.** Ужо цяпер санітарнай ачысткай ахоплены 50 рэк і ручаёў, а таксама 70 азёр.

У першым квартале такія работы запланавана выканаць у Віцебску на рацэ Лучоса і вадаёме ў парку 1000-годдзя Віцебска. Усяго на тэрыторыі нашай краіны на водных аб'ектах зацверджана 488 зон адпачынку, у дачыненні да якіх штогод (з 1 да 31 мая) камісіямі праводзіцца іх агляд з мэтай прыёмкі гатоўнасці да летняга сезона.

У Беларусі зарэгістраваны 1183 значныя крыніцы, з якіх 815 уладкаваны. У прыродным стане знаходзяцца 368 крыніц, з іх 104 размешчаны ў цяжкадаступных месцах. Сёлета запланавана навесці парадак каля 21 крыніцы краіны.

Начальнік аддзела таксама заўважыла, што ў чэрвені плануецца міжнародная беларуска-расійская акцыя па ачыстцы трансгранічных водных аб'ектаў «Беражом галоўнае», кожны ахвотны можа ўзяць у ёй удзел.

## БЕСПЕРАПЫННАЕ ЦВІЦЕННЕ

Як расказала **кіраўнік службы па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі УП «Мінскзеленбуд» Наталля ЛІСОЎСКАЯ,** планы па азяляненні і кветкавым афармленні гарадскіх тэрыторый, абнаўленні малых архітэктурных формаў распрацоўваюцца штогод. Год добраўпарадкавання выключэннем не стаў, больш за тое, планавыя заданні былі павялічаны.

Прадстаўнік «Мінскзеленбуду» заўважыла, што ў спрыяльны вясновы перыяд спецыялісты прадпрыемстваў зялёнай гаспадаркі ўжо прыступілі да высадкі дрэў і кустоў. Усяго запланавана пасадка каля 20 тысяч дрэў і каля 150 тысяч кустоў. Дадатковыя саджанцы высадзяць на транспартных развязках і адхонах азялянёных тэрыторый уздоўж МКАД.

Практыка высадкі руж на вуліцах Мінска сёлета працягнецца. У маі—чэрвені высадзяць больш за 50 тысяч кустоў. Што датычыцца кантэйнернага азелянення сталічнай вулічна-дарожнай сеткі, яно вядзецца планамерна. Наталля Лісоўская растлумачыла, што асабліва актуальныя такія варыянты азелянення на пляцоўках з цвёрдым пакрыццём, дзе няма магчымасці пасадкі раслін у грунт. Будуць ствараць кветнікі з аднагадовых кветкавых раслін, ужо цяпер запланавана высадзіць каля 1,34 мільёна кветак.

«У пачатку красавіка ўпрыгожым агароджы раздзяляльных палос па праспекце Пераможцаў скрынямі з віёлай і марозаўстойлівымі раслінамі. У сярэдзіне мая на змену гэтым кампазіцыям будуць выстаўлены кашпо з аднагадовымі ампельнымі раслінамі, а завершыць кветкавае афармленне восеннюю ўстаноўка скрынь з хрызантэмамі».

Разам з тым для захавання балансу кветкавых кампазіцый, як і ў папярэднія гады, спецыялісты зялёнай гаспадаркі зоймуцца пасадкай шматгадовых кветак. Яны створаць кампазіцыі бесперапыннага цвіцення з драўнінна-кустовых насаджэнняў з выкарыстаннем шматгадовых кветкавых раслін, якія дазволяць забяспечыць дэкаратыўнасць сталічных вуліц з красавіка да замаразкаў позняй восені.

**Сяргей КУРКАЧ.**








**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества коммунального унитарного предприятия **«Стародорожский ремонтно-строительный участок»** (УНП 690724428),
объявляет о проведении **15.04.2025 г.** в 10.00 публичных торгов по адресу:
г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501.

**Перечень предметов торгов публично размещен на сайте: bankrot-torg.by.**
Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. 80296026166.
Продавец: Коммунальное унитарное предприятие «Стародорожский ремонтно-строительный участок», тел. 8 (029) 6953010.
Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; 80296083100; contact@bankrot-torg.by.
Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **14.04.2025 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).
Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **14.03.2025** по 17.00 **14.04.2025** по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, ком. 501.
Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.
Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты проведения торгов.
Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.
Оформление результатов торгов в день проведения торгов.
В случае признания торгов несостоявшимися, предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 %.
Затраты на организацию и проведение торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре, аукционный сбор по лотам №№ 1, 2 – 3 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20%), по лоту № 3 – 7 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %).
Дополнительные условия: нет.
Срок подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 15 рабочих дней с даты проведения торгов.



В **суд Центрального района г. Минска** поступило заявление Джамаловой Людмилы Ивановны о признании умершим ДЖАМАЛОВА Алексея Владимировича, 17.01.1985 года рождения, место рождения – г. Минск, зарегистрирован по месту жительства, по адресу: г. Минск, ул. Орловская, 86/4-214, последнее известное место жительства – г. Минск, ул. Некрасова, 35/2-262. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Джамалове Алексее Владимировиче, сообщить их суду Центрального района г. Минска в течение двух месяцев с момента опубликования объявления.



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества должника.

**Электронные торги состоятся 31.03.2025 в 11.00.**

Лот № 1:
**Механическая мастерская с котельной**
с инв. № 600/С-97057. Площадь – 596,8 кв. м.
Назначение: здание нежилое.
Адрес: Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, 68/1, район д. Лесковка.

Обременение: 1. Ипотека. 2. Запрет на совершение регистрационных действий. 3. Арест. 4. Аренда.
Идентификационные сведения о правообладателе: открытое акционерное общество «МИНСКВОДСТРОЙ».
Начальная цена продажи – 699 840,00 руб.
Задаток – 69 984,00 руб.
Земельный участок 623680600001000039 площадью 2,1006 га. Целевое назначение: для обслуживания производственной базы. Право постоянного пользования. Обременение: запрет на совершение регистрационных действий. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставлены на электронные торги.
Шаг электронных торгов – 5 %.
1. Победитель электронных торгов либо единственный участник, согласный приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на пять процентов (далее – Претендент на покупку), обязаны оплатить полную стоимость приобретенного на электронных торгах Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов. Указанный срок перечисления денежных средств Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен по согласованию с уполномоченным органом, но не более чем на 20 рабочих дней.
2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору электронных торгов стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счет-фактуры в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронных торгов.
3. Переход права собственности на приобретённый на электронных торгах Объект недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов.
Организация и проведение электронных торгов осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе порядке их проведения, об оформлении участия в них размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **26.03.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА
Государственное предприятие
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор торгов и Оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 (017) 516 80 64)*
по поручению государственного учреждения
**«Центр по обеспечению деятельности бюджетных организаций Несвижского района»**
*(222603, Минская область, Несвижский район, аг. Заозерье, ул. Пригородная, 1)* проводит повторный открытый аукцион
**по продаже автомобиля легкового LADA VESTA, 2016 г. в.,**
**регистрационный знак 2386 ОН-5, кузов (VIN) XTAGFL130GY027580, цвет черный, инвентарный номер 01510026, находящегося по адресу: Минская область, Несвижский район, аг. Заозерье, ул. Пригородная, 1.**
**Начальная цена** (без НДС) – **10 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 000,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 50 %.**
Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.
Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.
*Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 15.01.2025.*
Электронные торги состоятся **02.04.2025** в **10.00**.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **31.03.2025** до **17.00.**
**Тел.: 8 (017) 516-80-65; 8 (029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра транспорта 8 (01770) 2-02-39, время осмотра – с 9.00 до 16.00, понедельник – пятница.**
УНП 693160615



**Брестский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества, принадлежащего**
**РУП «Брестское отделение Бел.ж.д.»**

| Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, руб. | Срок договора аренды |
|---|---|---|
| **ЛОТ № 1:** право заключения договора аренды недвижимого имущества: части площади пола площадью 1,0 кв. м в здании вокзала (инв. № ЕГРНИ 124/С-22128) по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, Линовский с/с, ст. Оранчицы, 2 | 11,10 | 3 года |

**Организатор аукциона:**
Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», 224005, г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел. 8 (0162) 40 87 01

**Аукцион состоится 04 апреля 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-41, 40-87-01

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/auction/29619)

ІНАВАЦЫІ Ў МЕДЫЦЫНЕ

# КАБ НОЧ НЕ СТАЛА КАШМАРАМ

**7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 19.50** Навіны.
**09.40, 12.50, 18.40** Баявое дзяжурства (12+).
**10.10, 12.35, 16.15, 17.45, 20.35, 2.15, 3.30, 4.15** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**10.35, 13.45, 15.15, 18.10, 20.05, 22.15, 23.15, 1.15, 3.15** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**11.10, 11.35, 14.10, 21.15, 23.30, 0.20, 4.30** Тэлефільм (16+).
**14.00, 17.20** Навіны. Мінск.
**15.30, 18.30** Навіны рэгіёна.
**19.35, 22.35** Зразумелая палітыка (12+).
**21.55** Аўтарскі погляд (12+).
**22.50, 0.50, 3.45** Навіны-сеткі (12+).
**1.30, 2.30** Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05** «Новая раніца».
**9.05, 10.05 Серыял «Кулагіны. Новыя серыі» (16+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.40** Гумарыстычная праграма (16+).
**12.50** «Кропкі над і» (16+).
**14.40** «60 Хвілін».
**17.40 Тэлесерыял «Пагоня за мінулым» (12+).**
**18.45** «Прамы эфір» (16+).
**21.30, 23.15 Фільм «Незнаёмка ў люстэрку» (12+).**

### НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 7.10, 8.25, 13.25, 22.40, 23.40** Сёння. Галоўнае.
**6.20** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.25** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35** «НЗ.by».
**9.00, 10.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**12.25** «Экспертыза злачынстваў» (16+).
**13.30** «Надзвычайнае здарэнне».
**13.55** «ДНК» (16+).
**14.55** «Чакай мяне» (12+).
**16.40, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15** Псіхалогія падману (16+).
**20.45, 22.15, 22.45 Серыял «Гаспадар» (16+).**
**21.45** «НЗ.by: час вынікаў».
**23.15, 23.55 Серыял «Пяць хвілін цішыні. Мора і горы» (12+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.00, 17.10, 20.25, 22.40** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Народжаная зоркай». Маст. фільм (12+).**
**9.55** «Кадры жыцця».
**10.45, 17.20 «Марскі паляўнічы». Маст. фільм (12+).**
**12.00** «Спяваю і ўсё паспяваю».
**13.10, 19.10 «Я крочу па Маскве». Маст. фільм (12+).**
**14.25** «Апошні дзень» (12+).
**15.00** Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь імя І. І. Жыновіча. Канцэрт «Знаёмыя мелодыі».
**16.40** «Сіла веры».
**18.30** «Легенды эстрады».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.50** Вечары з сімфанічным аркестрам.

### Беларусь 5

**6.55** Біятлон. Чэмпіянат Расіі. Жанчыны.
**7.55** Хакей для ўсіх.
**8.25** Хакей. КХЛ. «Аўтамабіліст» — СКА (Санкт-Пецярбург).
**10.20** Нашы ў КХЛ.
**10.50, 22.20** Хакей. Чэмпіянат Беларусі.
**12.45** Як гэта было.
**13.15** Футбол. Чэмпіянат Расіі. ЦСКА (Масква) — ФК «Хімкі».
**15.10** На спорце.
**15.30** Змешаныя адзінаборствы.
**19.30** Хакей. КХЛ. ЦСКА (Масква) — «Дынама-Мінск». У перапынках «Спорт-цэнтр».
**21.50** Авертайм.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05 Дэтэктыў «Кулагіны» (16+).**
**12.00 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).**



**12.45** Суд вырашыць (16+).
**13.55** Сямейныя гісторыі (16+).
**14.35** Карысная праграма (16+).
**14.50** «На нажах» (16+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00** «Абмен дамамі» (16+).
**18.25** «Госць каля парога» (16+).
**19.45** «Геаграфія «Уральскіх пельменяў». Францыя» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.15** «Вялікія дзяўчынкі» (16+).
**0.40** «Сям'я. Перазагрузка» (16+).

## Субота, 22 сакавіка

### Беларусь 1

**6.25 Меладрама «Прывіднае шчасце» (12+).**
**8.05** Існасць.
**8.30** Сэнс жыцця (12+).
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.20** «Добрай раніцы, Беларусь!» (12+)
**10.05** Здаровае (12+) [СЦ].
**10.55** Маршрут пабудаваны (12+).
**11.30** Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
**12.20** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**12.40 Меладрама «Чужая» (12+).**



**13.35** «Я ведаю» (6+).
**15.20** Краіна.
**15.50** Адзін дзень (12+).
**16.20** Таямніцы следства (12+).
**16.50, 19.10 Меладрама «Мая чужая дачка» (12+).**
**21.00** Панарама.
**21.50** «Добры вечар!» (12+)
**23.20 Меладрама «Нібы не было разлукі» (16+).**

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**7.10, 9.10** «Наша раніца ў суботу».
**10.00** «Трывожная кнопка» (16+).
**10.30** «Белыя Росы» (12+).
**11.00** «Перазвон».
**11.55 Фільм «Асколкі шчасця-2» (12+).**
**16.20 Фільм «Добрымі намерамі» (12+).**
**20.00** «Як паглядзець».
**21.00** «Метэагід».
**21.25 Фільм «На арэлях лёсу» (12+).**
**1.15 Фільм «Святло» (16+).**

### СТБ

**6.05, 8.30 «Жанчына ў бядзе-3». Серыял (16+).**
**7.40** «Анфас».
**8.00** «Цэнтральны рэгіён».
**10.10** «Спецыяльны рэпартаж».
**10.30, 13.30, 16.30, 19.30** Навіны «24 гадзіны».
**10.45** «Свае».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.30** «У пошуках ісціны. Жыццё пад градусам».
**12.15** «Дарагія таварышы» (16+).
**13.45** «Следства вядзе КДБ» (16+).
**14.30, 16.50 «Праспект абароны». Серыял (16+).**
**20.20** «Палітыка без гальштукаў і купюр».
**20.35** «Тайныя спружыны палітыкі».
**20.50** «СТБ-спорт».
**21.00 «Хуткая дапамога». Серыял (16+).**
**0.15** «Дзевяностыя» (16+).

### МІР

**5.00, 6.10, 8.50, 2.30** Мультфільмы (6+).
**5.45** «Усё, як у людзей» (6+).
**6.30 Маст. фільм «Лёгкае жыццё» (16+).**
**8.20** «Гістарычны дэтэктыў з Мікалаем Валуевым» (16+).
**9.15** «Гульня ў кіно. Мультфільмы» (16+).
**10.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**10.10 Маст. фільм «Зямля Саннікава» (16+).**
**12.10, 16.15, 18.45 Тэлесерыял «Страсці па Чапаю» (16+).**
**1.40** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (16+).

### Першы Інфармацыйны

**5.00, 5.20, 6.05, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.40, 9.35, 10.25, 11.25, 12.25, 13.25, 14.30, 15.30, 15.50, 16.25, 17.30, 20.00, 20.20, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 0.05, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны. Дайджэст.
**5.10, 5.30, 6.15, 6.40, 7.10, 8.10, 14.50, 16.50, 18.50, 0.15, 1.05, 2.10, 3.05, 4.10** Дзень спорту.
**5.45, 11.30, 16.30** Навіны-сеткі (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**7.15, 7.40, 9.20, 10.15** Меркаванне клуба (12+).
**8.15, 9.40, 12.30, 15.35, 17.35, 18.30, 20.35, 23.40, 1.10, 4.15** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**8.30, 11.00, 14.00, 17.50, 19.50, 21.55** Вам тэлеграм (12+).
**8.45, 11.45, 15.20, 18.10, 20.05, 22.15, 23.15** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**9.00, 10.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**9.30, 12.45** Баявое дзяжурства (12+).
**10.10, 13.20, 17.20, 0.50, 2.15, 3.50** Тэхнаполіс.
**10.30, 13.30, 14.05, 16.10, 21.15, 22.30, 0.20, 3.10, 4.30** Тэлефільм (12+).
**11.10, 18.25, 20.50** Аўтарскі погляд (12+).
**17.25, 20.25, 22.25** Прагноз надвор'я з вядучым.
**19.10** Вакол планеты (12+).
**1.30, 2.30** Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Новая раніца».
**9.30** «Гісторыі Вялікай Краіны».
**10.25** «Дакрананне да святла».
**10.40** «Пуцёўка.BY».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30, 21.00** Беларусь. Навіны.
**11.40** «Нашы. Ваенкары» (12+).
**12.10** «Доктар Мяснікоў» (12+).
**13.10, 14.30 Фільм «Заказаны па ўласным жаданні» (12+).**
**15.20** «Парад гумару» (16+).
**17.50** «Прывітанне, Андрэй!» (12+)
**19.45** «Плюс-мінус».
**21.30** Фільм «Самазванка» (16+).

### НТБ—Беларусь

**6.15** «Астрапрагноз».
**6.20, 07.10** Сёння. Галоўнае.
**6.25** Смачна есці (12+).
**7.25** Беларусы (6+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «НЗ.by: час вынікаў».
**8.50** Адзін дзень (12+).
**9.25** «Проста і смачна» (6+).
**10.20** Знак якасці (6+).
**10.45** «Галоўная дарога» (16+).
**11.20** «Жывая ежа з Сяргеем Малазёмавым» (12+).
**12.10** Кватэрнае пытанне (0+).
**13.10** «Паедзем, паядзім!» (12+)
**14.10 Фільм «Гадзіннік спыніўся апоўначы» (12+).**
**16.25** «Следства вялі...» (16+)
**17.20** «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.10** «Суперстар!» (16+)
**22.40** «Ты не паверыш!» (16+)
**23.35 Фільм «Саюз непарушны» (16+).**

### Беларусь 3

**7.30** «Баранкін, будзь чалавекам!» Мультфільм (6+).
**7.50** «Хвасты». Мультфільм (0+).
**8.10** «Сіла веры».
**8.35, 16.40** «Навіны культуры».
**8.45 «Дзеці Дон Кіхота». Маст. фільм (12+).**



**10.05** «Беларуская кухня».
**10.35** «Спяваю і ўсё паспяваю».
**11.00** «То! Лато».
**11.25 «Вечны кліч». Маст. фільм (12+).**
**16.15** «Навука побач» (6+).
**16.55** «Веды ў кубе».
**17.35** «Кожны трэці».
**18.45 «У зоне асобай увагі». Маст. фільм (12+).**
**20.25** «Суразмоўцы».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Гарачы снег». Маст. фільм (12+).**
**22.45** «Люблю і памятаю».
**23.25** «Перазвон». Дак. фільм (12+).

### Беларусь 5

**6.55** Хакей. КХЛ. ЦСКА (Масква) — «Дынама-Мінск».
**8.50** Фіз-ра.
**9.20** Вялікі спорт.
**10.00** Настольны тэніс. Асабісты чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. Жанчыны.
**15.00, 22.00** Змешаныя адзінаборствы.
**16.55** Хакей. КХЛ. «Тарпеда» (Ніжні Ноўгарад) — СКА (Санкт-Пецярбург). У перапынках «Спорт-цэнтр».
**19.20** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — «КУС-Дынама» (Гродна). У перапынку «Спорт-цэнтр».
**21.30** Як гэта было.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
**9.00, 16.10** Тэлебарометр.
**9.05** «На нажах» (16+).
**11.15** «Пухнатыя ашуканцы» (6+).
**12.30 Камедыя «Сэрца і як ім карыстацца» (12+).**
**14.10** Як дома (16+).
**14.40** «Госць каля парога» (16+).
**16.00** Карысная праграма (16+).
**16.15 Дэтэктыў «Старая гвардыя. Развітальная вечарынка» (12+).**
**19.55** «Бітва сватоў» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.15 Серыял «Галя, у нас адмена!» (16+)**

## Нядзеля, 23 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00 Меладрама «Прывіднае шчасце» (12+).**
**7.35** Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.20** «Арсенал» (12+).
**9.50 Меладрама «Не кажыце мне пра яго» (16+).**



**11.40** «Незабытыя салдаты». Відэафільм (12+).
**12.20** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.45 Меладрама «Чужая» (16+).**
**13.35** «Я ведаю» (6+).
**15.25** Вакол планеты.
**16.05** Адзін дзень (12+).
**16.35, 19.10 Меладрама «Сустрэчная паласа» (12+).**



**20.40** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.35 Меладрама «Нібы не было разлукі» (16+).**

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**7.10** «Смех з дастаўкай дадому» (12+).
**7.30** «Усё маё жыццё — суцэльная памылка» (12+).
**8.25** «Народны ДАСТ» (16+).
**9.10, 1.10** «Метэагід».
**9.35** «Здароўе» (16+).
**10.40** «Народны повар» (12+).
**12.00 Фільм «Шчаслівая шэрая мыш» (12+).**



**13.50, 16.20 Фільм «На арэлях лёсу» (12+).**
**18.10** «Тры акорды».
**20.00** Контуры.
**21.15 Фільм «Добрымі намерамі» (12+).**

### СТБ

**6.35 «Жанчына ў бядзе-4». Серыял (16+).**
**9.50** «Беларуская супержанчына».
**10.00** «Вялікі горад».
**10.30, 13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**10.45** «Следства вядзе КДБ» (16+).
**11.35, 13.45, 17.00, 21.15 «Першы аддзел». Серыял (16+).**
**16.45** «Сенат».
**19.30** «Тыдзень».
**20.50** «Слова і справа».
**21.00** «Спорт-таймер».
**23.30** «Паляванне на маньяка» (16+).
**0.50** «Дзевяностыя» (16+).

### МІР

**5.00, 4.30** Мультфільмы (6+).
**5.30 Маст. фільм «Адстаўной казы барабаншчык» (16+).**
**6.45 Маст. фільм «Дамы запрашаюць кавалераў» (16+).**
**8.20** «Дыктар робіць» (16+).
**9.30** «ФазэндаЛайф» (6+).
**10.00, 16.00** Навіны.
**10.10, 16.15, 19.30, 1.00 Тэлесерыял «Жыць спачатку» (16+).**
**18.30, 0.00** «Разам» (16+).

### Першы Інфармацыйны

**5.00, 5.25, 6.05, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 9.25, 10.30, 11.30, 12.25, 13.25, 14.45, 15.30, 16.35, 17.30, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 1.00, 3.00** Навіны. Дайджэст.
**5.05, 5.30, 6.15, 7.10, 8.10, 14.50, 16.50, 0.25, 1.05, 2.20, 3.05, 4.20** Дзень спорту.
**5.10, 6.40, 10.15, 12.30, 15.40, 17.35, 18.40** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**5.45, 7.40, 11.35, 15.20, 18.15, 20.05, 22.15, 23.15** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**6.20, 7.20, 9.20, 13.35, 16.45, 19.45** Сусветная навука (12+).
**7.15, 11.20, 16.40, 18.30** Аўтарскі погляд (12+).
**8.15** Вакол планеты (12+).
**9.00, 10.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**9.30, 10.35, 14.15, 16.20, 19.15, 21.15, 22.25, 23.30, 3.10, 4.25** Тэлефільм (12+).
**11.00, 16.00, 0.30** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**11.50** Вам тэлеграм (12+).
**12.45, 18.35, 22.50** Баявое дзяжурства (12+).
**13.20, 17.20, 19.10, 21.50, 0.50, 3.50** Громаў LIVE (12+).
**13.40** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**14.00, 18.00, 1.10** Твой горад (12+).
**20.35** Зразумелая палітыка (12+).
**0.05, 2.00, 4.00** Галоўны эфір.
**1.30, 2.30** Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

**6.55 Фільм «Самазванка» (16+).**
**10.15** «Рэцэпт сапраўднага беларуса».
**11.00, 14.00, 17.00** Весткі.
**11.35** «Свае».
**11.50** «Нашы. Ваенкары».
**12.20** «Вялікія перамены».
**13.15** «У пошуках ісціны».
**14.30** «Крым» (12+).
**15.35** «Гумар! Гумар! Гумар!!!» (16+)
**17.50** «Песні ад усёй душы» (12+).
**20.00** Весткі тыдня.
**21.00** «Акцэнты».
**22.00** «САСС упаўнаважаны заявіць».
**22.55** Масква. Крэмль. Пуцін.
**23.30** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.20** Сэнс жыцця (12+).
**6.50** Майстар-клас: як гэта зроблена? (6+)
**7.25** Беларусы (6+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Навука побач» (6+).
**8.55** Беларуская супержанчына.
**9.05** VeloLove (6+).
**9.25** Ежа хоць куды (6+).
**10.20** Сямейная справа (6+).
**10.45** «Кватэрнае пытанне.By» (12+).
**11.15** «Першая перадача» (16+).
**11.45** «Цуд тэхнікі» (12+).
**12.35** «Дачны адказ» (0+).
**13.30** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.25 Камедыя «Белыя росы» (12+).**



**16.20** «Следства вялі...» (16+)
**18.05** «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.20** «Зоркі сышліся» (16+).
**21.35 Фільм «Мсціўца. Страшны лес» (16+).**

### Беларусь 3

**7.10** «Святыні Беларусі».
**7.35** «Веды ў кубе».
**8.15 «У зоне асобай увагі». Маст. фільм (12+).**
**9.50** «Наперад у мінулае».
**10.30** «Беларуская кухня».
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.50, 20.00** «Культурны тыдзень».
**12.30** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**12.55 «Кубанскія казакі». Маст. фільм (12+).**



**14.45** Дзяржаўны акадэмічны ансамбль танца Беларусі.
**16.30** «Жывая спадчына».
**17.00** «Суперлато».
**17.35** «Апошні дзень» (12+).
**18.15 «Гарачы снег». Маст. фільм (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Вечны кліч». Маст. фільм (12+).**

### Беларусь 5

**6.55** Настольны тэніс. Асабісты чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. Жанчыны.
**8.55** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — «КУС-Дынама» (Гродна).
**10.50** Каратэ. Чэмпіянат Беларусі.
**12.55** Баскетбол. Адзіная ліга. «Енісей» (Краснаярск) — ПАРМА (Перм).
**14.55** Баскетбол. Адзіная ліга. «Уралмаш» (Екацярынбург) — «Зеніт» (Санкт-Пецярбург).
**16.55** Хакей. КХЛ. ХК «Сочы» — «Дынама-Мінск». У перапынках «Спорт-цэнтр».
**19.20** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. ВРЗ (Гомель) — БЧ (Гомель). У перапынку «Спорт-цэнтр».
**21.20** Вынікі тыдня.
**22.05** Змешаныя адзінаборствы.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
**9.00, 10.40, 16.35** Тэлебарометр.
**9.05** «На нажах» (16+).
**10.05** Я з вёскі (12+).
**11.10** Смачна есці (12+).
**11.50** «Вялікія дзяўчынкі» (16+).
**15.20** «Бітва сватоў» (16+).
**16.40** «Геаграфія «Уральскіх пельменяў». Францыя» (16+).
**18.00 Камедыя «Сэрца і як ім карыстацца» (12+).**
**19.40** «Абмен дамамі» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.15 Серыял «Фітнес» (16+).**

**НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ**

*Таццяна Дамаронак, інжынер-энергетык па прафесіі, літаратурнай творчасцю займаецца з 2000 года. Піша казкі, а таксама апавяданні для дзяцей і дарослых. Аўтар кніг «Казкі сінявокай зямлі», «Вялікая і Малая Мядзведзіцы», «Хто Сароку напалохаў?», «Вясёлка над лесам», «Мы не забудзем!» і іншых.*

*У апавяданні «Дзявочы лянок» чытачам прапануецца акунуцца ў жыццё невялічкай вёскі ў беларускай глыбінцы сто гадоў таму. Добрыя, разумныя, адкрытыя і шчырыя Андрэй і Домна нястомна працуюць, гадуюць дзяцей і моцна любяць свой родны край. У іх дачок Кацярыны і Ганны ёсць мара — вырасціць лён. І адначасова яны звяртаюцца да бацькі з просьбай вылучыць ім для гэтага кавалачак зямлі...*

**Алена БРАВА.**

## Таццяна ДАМАРОНАК

# ДЗЯВОЧЫ ЛЯНОК

У адзін з вясновых дзён Вольга прачнулася раней звычайнага, калі забіяка сонечны праменьчык прабег па яе твары. Дзяўчынка зажмурылася, паднялася з ложка і падышла да акна. А там у небе ўжо ярка свяціла сонца, па двары беглі вясёлыя ручайкі з падталага снегу. «Надышла сапраўдная вясна! Хутка ўвесь снег растане, і я змагу лётаць басанож на луг, да рэчкі, у бярозавы гай!» — узрадавалася Вольга. Ёй надакучыла ўсю зіму сядзець у хаце каля акна, бо зімовага абутку ў малой не было, нават лапцікі леташнія знасіліся. Босую ў двор яе, вядома ж, не пускала маці, баючыся, што дачка застудзіцца і захварэе. Аднак да школы тата абяцаў сплесці малодшай дачцэ новыя лапцікі з ліпавага лыка.

Да радасці Вольгі, вясновае цяпло трохі прагрэла зямлю. І вось дзяўчынка ўжо бяжыць па ёй, пераступаючы бруд і лужыны, — туды, дзе зазелянела маладая траўка, прабіліся першыя кветкі. Ох, і прыгожы ж яе родны край! Неба чыстае, без адзінай аблачыны, празрыстае паветра пахне падталым снегам і вільгаццю, якая выпарваецца з зямлі. Недалёка ад вёскі, за полем, цячэ рака Друць, правы прыток магутнага Дняпра. Але ў гэтым месцы рака яшчэ вузкая, вада ў ёй халодная і чыстая, як у крыніцы. А крыніцы і сапраўды тут ёсць, хаваюцца пад балотамі. Гавораць, што Друць выцякае з такіх балот тоненькай крынічкай.

Аббегшы вёску, Вольга вярнулася дахаты. На суседнім двары крычаў певень. Ён сядзеў на тыне і махаў крыламі. Яркі чырвоны грабеньчык трапятаў на галоўцы. Заглядзеўшыся на пеўня, дзяўчынка не заўважыла сваіх сясцёр Кацярыну і Ганну. Стомленыя, яны вярталіся са школы.

— Вальгута! Куды ты бегала па халоднай зямлі? Ідзі дахаты. Мама будзе шукаць! — пажурылі яе сястрычкі.

А ў хаце пахне смачным супам і бульбяной бабкай. Мама Домна праспешвае сваіх дамачадцаў. Ёй трэба пасадзіць усіх за вялікі стол, сытна накарміць. Затым бацька Андрэй пачне абмяркоўваць хатнія справы і вясковыя навіны са старэйшымі сынамі. Вольга ў гэтых справах не ўдзельніца. Яна заб'ецца на печ разам з коткай ці пацішку збяжыць да сваёй старэнькай бабулі ў суседнюю хату.

У Андрэя і Домны пяцёра дзяцей. Два дарослыя сыны Піліп і Мітрафан працуюць, сёстры Кацярына і Ганна вучацца ў школе. Вольга малодшая, яна нарадзілася ў сямнаццатым годзе і яшчэ толькі збіраецца праз год стаць першакласніцай. Бацькам, ужо немаладым, весці ўсю гаспадарку было б не пад сілу. Старэйшыя дзеці з вясны да восені рупліва ім дапамагаюць.

Неўзабаве на палях растаў увесь снег, зямля добра выгралася, і ў вёсцы закіпела праца. Мужчыны, а часам і жанчыны ўскопвалі зямлю з дапамогай плугоў і коней, рыхлілі яе. Сяляне ўзаралі свае дзялянкі, каб пасадзіць там насенне пшаніцы і аўса, проса, бульбы.

Бацька Вольгі разам з сынамі таксама рыхтаваў зямлю для вясновай сяўбы. Тым часам Кацярына з Ганнай спыталі ў матулі:

— Ці не дасць нам тата кавалачак зямлі? Мы вельмі хочам пасадзіць лён. Нашы старыя спадніцы і сукенкі паабнасіліся. Калі мы вырасцім лён, то з ільнянога валакна сатчэм палатно і сшыем усім нам новую адзежу, — прасілі дзяўчаты, жаласна гледзячы ў матуліны вочы.

Яна з любоўю абняла, пацалавала іх. Як жа адмовіць дарагім дачушкам, бо яны так стараюцца, ходзяць у школу, ды яшчэ дапамагаюць ёй па гаспадарцы. Маці разумела, што яны падраслі, ім хочацца лепш адзецца, каб вясковыя хлопцы заглядаліся на іх. А прыгажосці ў Кацярыны з Ганнай не займаць. Вунь якія доўгія косы ў абедзвюх, вочы блакітныя ласкавыя, паходкі лебядзіныя. «У маіх дзяўчынак добрыя гарачыя сэрцы, працавітыя рукі, яны дапамагаюць мне ва ўсім, умеюць зрабіць лепш за мяне любую працу, — разважала маці, — трэба дапамагчы ім».

— Не хвалюйцеся, мае прыгажуні, — сказала яна, — я спытаю ў бацькі. Думаю, ён пагодзіцца.

Так, бацька пагадзіўся. Але разумеў, што яму прыйдзецца менш пасадзіць бульбы ці пшаніцы, а можа, аўса. Вядома, не толькі сям'ю трэба накарміць, але і жывёл таксама. Усе харчы прыходзілася дабываць на сваіх дзялянках: цяжкае было ў той час жыццё на вёсцы. «Добра, пасаджу менш аўса, а сена, дасць Бог, накосім больш, было б толькі добрае надвор'е», — вырашыў ён. Дочак крыўдзіць нельга. Яны маладыя і ўжо хутка стануць нявестамі.

— Тата дазволіў! — цешыліся дзяўчаты. Яны паспяшаліся заняцца пасадкай ільну, бо вясна ж у поўным разгары.

Усю зіму сёстры берaглі льняное насенне для пасеву і зараз асцярожна пасадзяць яго ў зямлю, не страціўшы ніводнага зярнятка. У народзе кажуць: «Пасееш лён — пажнеш золата». У вольны ад вучобы дзень сярэдзіны красавіка з раніцы Кацярына з Ганнай ужо былі на раллі і прыступілі да пасадкі льну-даўгунцу. А пасля — зноў вучоба і хатнія справы, якіх заўсёды безліч.

Вось і лета яснае ў поўным разгары. Дні сталі даўжэйшымі, ночы — зусім кароткімі.

— Каця, паглядзі, як наш лён расквітнеў! — усміхнулася Ганна.

Сястрычкі прыйшлі на раллю прапалоць і падрыхліць пасевы. Яны залюбаваліся, гледзячы на далікатныя кветачкі лёну. Гэта было так прыгожа! Блакітныя хвалі калыхаліся, як марскія, і тысячы вачэй кветак весела ўсміхаліся дзяўчатам.

— Так, усё ідзе добра! Праз два тыдні наш лён адкрасуе, і тады замест кветак завяжуцца скрыначкі, — адказала Каця.

У народзе кажуць: «Лён два тыдні квітнее, чатыры тыдні спее, на сёмы тыдзень насенне ляціць».

Нарэшце, надышоў час для Кацярыны з Ганнай збіраць ураджай ільну. Вольга пабегла на поле ўслед за сёстрамі. Яны абяцалі паказаць ёй, як акуратна вырываць ільняныя сцёблы з зямлі, а затым складаць у снапы. Цэлы дзень працы, і вось ужо на полі ў барознах замест ільну стаяць снопікі, злучаныя ў «бабкі».

— Так лён хутчэй падсохне, а калі змокне, то зноў высахне, — сказалі сёстры.

Кацярыне з Ганнай яшчэ хопіць працы. Каб потым атрымалася добрае мяккае валакно, лён трэба будзе церабіць, камячыць. І толькі калі са сцёблаў дзяўчаты выцягнуць белае валакно, па-народнаму «кужалёк», яны будуць з дапамогай калаўрота прасці з яго доўгія кудзелістыя белыя ніткі: кудзелю. Гэта няхітрая, але карпатлівая праца. Трэба быць спрытнай і ўважлівай, каб спрасці тоненькія льняныя нітачкі. Час рабіць гэта настане, калі будуць імжыць восеньскія дажджы. А школа яшчэ працягнецца ў іх жыцці.

Увосень іх сястрычка Вальгута таксама пайшла вучыцца.

— Мама! Мне падабаецца вучоба, — казала яна матулі. Вользе было цікава слухаць настаўніка і запамінаць усё, што ён казаў.

У канцы першага класа дзяўчынка навучылася чытаць і пісаць, чаму была вельмі рада. Цяпер яна магла прачытаць словы ў газеце, якую брат Піліп прыносіў дахаты. Дзяўчынка пачала разумець, што жыве ў краіне Саветаў. Але ў пачатку вучобы яна з цяжкасцю прывыкала да школьнага жыцця. Аднак не маркоцілася, нават імкнулася дапамагаць старэйшым сёстрам. Яны цэлымі вечарамі «сядзелі крукам» за ўрокамі і рабілі хатнія справы. У снежаньскія дні за калаўротам Кацярына з Ганнай пралі льняныя ніткі. «Я б не вытрымала такую працу», — думала Вольга, назіраючы за сёстрамі.

На радасць дзяўчат, да навагодніх свят усе льняныя ніткі былі спрадзены. А пасля Каляд у сясцёр пачаўся новы этап працы: яны пачалі ткаць палотны на кроснах. «Тчы палотны пры лучыне — не будзе ў хаце журбы», — казалі тады адно аднаму сяляне.

Сёстры не маркоціліся. Жыццярадасныя, светлыя і добрыя дзявочыя сэрцы заўсёды ўмелі знаходзіць радасць у сваім жыцці. Працуючы за калаўротам ці за кроснамі, дзяўчаты любілі спяваць. Прыгожыя народныя песні дапамагалі ім у працы. Далікатныя галасы дзяўчат цешылі родных. У хаце ўсе разумелі: да вясны ў Каці з Ганнай і нават у кагосьці яшчэ з сям'і будуць прыгожыя ўборы з новага льнянога палатна. Сёстры адбеляць яго і сшыюць сабе сарафаны, у якіх будуць красавацца ўвесну і ўлетку, прыцягваючы захопленыя позіркі хлопцаў.

«У хаце Андрэя з Домнай жывуць працавітыя дзяўчаты, добрыя майстрыхі, прыгажуні! — разляталася па вёсцы. — І не за гарамі той час, калі да іх прыйдуць сваты ад такіх жа добрых і працавітых вясковых хлопцаў».

... І як жа хочацца верыць, што камусьці з маладых дзяўчат таго далёкага часу, якія нарадзіліся ў беларускіх вёсачках, усміхнулася ў жыцці шчасце! Хоць, вядома, не ўсім. У тыя часы хваробы, якія яшчэ не навучыліся лячыць, губілі маладыя жыцці. А потым была Вялікая Айчынная вайна. Але ўсё ж такі камусьці з дзяўчат абавязкова пашанцавала. Інакш быць не магло! Шчасця і радасці вам, дарагія беларусы, ва ўсе будучыя стагоддзі!



**ОЗЕРСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ**

сообщает о проведении **16 апреля 2025 г.** по адресу: агрогородок Озеро, улица Дзержинская, 27б в 10.00 открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| Лот № | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | | | | | | |
| 1 | Минская область, Узденский район, агрогородок Озеро, улица Садовая, участок № 13, кадастровый номер 625682508601000907 | 0,2052 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 48 000.00 | 144.01 + публикация в газете | 4 800.00 |
| 2 | Минская область, Узденский район, деревня Дубище, улица Полевая, участок № 13, кадастровый номер 625682504101000079 | 0,1178 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги | 22 000.00 | 2 100.60 + публикация в газете | 2 200.00 |
| 3 | Минская область, Узденский район, деревня Дубище, улица Полевая, участок № 14, кадастровый номер 625682504101000080 | 0,1199 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги | 22 000.00 | 2 061.49 + публикация в газете | 2 200.00 |
| 4 | Минская область, Узденский район, деревня Дубище, улица Светлая, участок № 11, кадастровый номер 625682504101000083 | 0,1234 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги | 22 000.00 | 2 268.30 + публикация в газете | 2 200.00 |
| 5 | Минская область, Узденский район, деревня Боханы, улица Центральная, участок № 14А, кадастровый номер 625682501601000035 | 0,1665 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги | 25 000.00 | 2 663.08 + публикация в газете | 2 500.00 |
| 6 | Минская область, Узденский район, деревня Боханы, улица Центральная, участок № 21, кадастровый номер 625682501601000034 | 0,1875 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги | 28 500.00 | 2 625.61 + публикация в газете | 2 850.00 |
| 7 | Минская область, Узденский район, деревня Суковцы, улица Центральная, участок № 24А, кадастровый номер 625682510601000077 | 0,1302 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с асфальтированной дороги | 24 000.00 | 2 523.15 + публикация в газете | 2 400.00 |
| 8 | Минская область, Узденский район, деревня Суковцы, улица Центральная, участок № 14, кадастровый номер 625682510601000081 | 0,2514 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги | 28 500.00 | 2 668.71 + публикация в газете | 2 850.00 |
| 9 | Минская область, Узденский район, деревня Сороковщина, улица Центральная, участок № 44, кадастровый номер 625682510101000162 | 0,2842 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водоснабжению. Подъезд с гравийной дороги | 24 000.00 | 2 168.38 + публикация в газете | 2 400.00 |
| 10 | Минская область, Узденский район, деревня Сороковщина, улица Вишнёвая, участок № 5Б, кадастровый номер 625682510101000167 | 0,1500 | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 21 000.00 | 2 288.54 + публикация в газете | 2 100.00 |

Задаток (10 % от начальной цены) перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на расчетный счет № BY97AKBB 36410625001436000000 в ЦБУ № 625 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, БИК AKBBBY2X, УНП 600110154, код назначения платежа – 40901 (перечисление гарантийного взноса). Получатель – Озерский сельский исполнительный комитет.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявление на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по рабочим дням – с 8.00–13.00, с 14.00–17.00, по адресу: Минская область, Узденский район, аг. Озеро, ул. Дзержинская, 27б.

Последний день приема заявлений – **11 апреля 2025 г. до 17.00.**

Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны предоставить следующие документы:

1) заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2) заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

3) копию документа, содержащего его идентификационные сведения (ксерокопию паспорта);

4) представителям гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предоставляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукционов и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробную информацию об аукционах, условиях участия можно получить по телефонам: **8 (01718) 65 382, 49 347; +375 (29) 5659160.**

НАДВОР'Е

# ХАЛОДНЫ «КУЛЬБІТ»

## Чакаецца наліпанне мокрага снегу плюс галалёдзіца

Як паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, нас чакаюць сур'ёзныя сінаптычныя змены. У найбліжэйшыя суткі і на выхадныя надвор'е карэнным чынам сапсуецца.



У пятніцу ўмовы надвор'я ў Беларусі будуць вызначаць атмасферныя франты ад цыклону, які ссоўваецца паблізу ад паўночна-заходніх меж нашай краіны. Паступае халодная паветраная маса. Воблачна з праясненнямі. Ноччу і раніцай на большай частцы тэрыторыі краіны, днём пераважна на паўночнай палове краіны пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу, які пераходзіць у мокры снег.

**Ноччу месцамі па паўночным захадзе Беларусі чакаюцца моцныя дажджы.** У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах слабы галалёд. Вецер паўднёвы з пераходам на заходні, паўночна-заходні парывісты, ноччу і раніцай у многіх раёнах, днём па ўсходзе краіны моцны парывісты. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад плюс 1 па паўночным захадзе да плюс 11 °С па паўднёвым усходзе, ноччу ў паўночна-заходніх раёнах ад нуля да мінус 3 °С. Атмасферны ціск ноччу будзе слаба падаць, раніцай і днём інтэнсіўна расці.

У суботу паўночна-заходнія і цэнтральныя раёны краіны будуць знаходзіцца ў вобласці павышанага атмасфернага ціску, у паўднёвых і паўднёва-ўсходніх раёнах краіны ўмовы надвор'я будзе фарміраваць актыўная сістэма атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы.

А следам на нашу краіну насоўваюцца «рэшткі» зімы. Будзе воблачна з праясненнямі, пераважна на паўднёва-ўсходняй палове краіны пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу.

Ноччу і раніцай па поўдні Беларусі чакаюцца моцныя ападкі, месцамі наліпанне мокрага снегу. Уначы і ўранку на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночнай чвэрці ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 7 °С па поўначы да плюс 3 °С па паўднёвым усходзе. Будзе не зусім утульна і днём з максімальнай тэмпературай ад нуля да плюс 7 °С.

У ноч на нядзелю замаразкі ўзмоцняцца. У гэтыя суткі надвор'е ў асноўным будзе фарміраваць воблнасць павышанага атмасфернага ціску, толькі днём па поўначы краіны адаб'ецца ўплыў франтальнага падзелу, які ссоўваецца з Рыжскага заліва. Пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў, толькі днём месцамі па поўначы краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Ноччу і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер няўстойлівы ўмераны, удзень месцамі па поўначы парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да мінус 9 °С, па паўднёвым усходзе краіны яна складзе мінус 1—2 °С. А вось днём стане крыху цяплей — ад плюс 2 да 8 °С.

**Сяргей КУРКАЧ.**






Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## Дарэчы

Пры моцным ветры і наліпанні мокрага снегу ўзнікаюць такія фактары небяспекі, як пашкоджанне або абрыў ліній сувязі і электраперадачы, адключэнне электрычных падстанцый, электраэнергіі ў населеных пунктах, паведамляюць у Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях. Таксама існуе рызыка пашкоджання або абвальвання слаба ўмацаваных канструкцый, дахаў будынкаў, збудаванняў, падзення дрэў. З-за зніжэння бачнасці магчыма цяжкасць руху транспарту, а таксама павелічэнне верагоднасці ўзнікнення ДТЗ.

Мокры снег, які выпадае пры станоўчай тэмпературы паветра, прыліпае да гладкіх сцен, галін і да дроту. Снег, які растае, назапашваецца з прычыны ліпкасці, на прадметах у выглядзе вісячага снежнага камяка. Наліплы снег робіць неадметнымі знакі сігналізацыі, дзейнічае сваім цяжарам разбуральна на тонкія разгалінаваныя прадметы (драты, дрэвы) або прыводзіць да іншых шкодных наступстваў.

Покрыва мокрага снегу, які ўтрымліваецца на прадмеце толькі з прычыны сваёй ліпкасці і знаходзіцца быццам бы ў вісячым становішчы, з'яўляецца адной з прычын абледзянення прадметаў. А вялікае наліпанне мокрага снегу можа прывесці да сапраўднага бедства!

Пры наліпанні мокрага снегу будзьце асцярожнымі на вуліцы, звяртайце ўвагу на цэласнасць паветраных ліній электраперадачы. Не выкарыстоўвайце электранагравальныя прыборы для абагравання памяшканняў — гэта можа прывесці да максімальных нагрузак на электраправодку і яе ўзгаранне. Замацуйце слаба ўмацаваныя канструкцыі на сваіх падворках, іх разбурэнне можа прывесці да траўміравання людзей.

## 14 САКАВІКА | Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

**1499** год — Мінск атрымаў Магдэбургскае права. Горад атрымаў права стварыць уласны орган самакіравання — магістрат, заснаваць гарадскі герб і сцяг горада. «...А таксама маюць магчымасць на зручным месцы паставіць ратушу, каля якой могуць мець таварную краму, збожжавыя клеці, цырульню. Там жа ў ратушы могуць мець бочку мерную і медны посуд з гарадскім гербам. Усе прыбыткі з усяго гэтага войт з бурмістрамі могуць скарыстаць дзеля гарадскіх патрэб...», гаварылася ў каралеўскай грамаце.

**1895** год — нарадзіўся Іван Іосіфавіч Валадзько (в. Плябанцы, цяпер у Мінскім раёне), беларускі архітэктар. Скончыў Маскоўскі вышэйшы мастацка-тэхнічны інстытут. З 1929 года працаваў у праектных установах Мінска. Сярод работ: 112-кватэрны жылы дом на вуліцы Маскоўскай, Літаратурны музей Я. Купалы ў Мінску, павільён СССР на міжнародным кірмашы ў Страсбургу (Францыя), жылыя, прамысловыя і грамадскія пабудовы ў Маскве.

**1931** год — нарадзіўся (б. вёска Гарбуны Шаркаўшчынскага раёна) Павел Дубашынскі, беларускі акцёр. Народны артыст БССР. Пасля заканчэння Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута працаваў у Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача, з 1967 года — у тэатры імя Я. Купалы. Дакладнасць малюнка, выразная пластыка, выкарыстанне гратэску, эксцэнтрыкі, уласцівых камедыйным ролям, створаным артыстам на сцэне. Значнага поспеху дасягнуў ў нацыянальным рэпертуары.

У свеце

**1905** год — заснаваны знакаміты сёння англійскі футбольны клуб «Чэлсі». Свой першы матч каманда згуляла ў сезоне 1905—1906 гадоў.

**1926** год — У СССР у сувязі з 45-й гадавінай забойства імператара Аляксандра II дзевяці былым удзельнікам замаху, якія жылі на той час, прызначана персанальная пажыццёвая пенсія.

**2004** год — У ЗША ў каліфарнійскай пустыні Махавэ прайшла гонка беспілотных аўтамабіляў-робатаў. Усе сышлі з дыстанцыі.


## «Ураджайнае лета — з любімай газетай!»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» ці на газету «Літаратура і мастацтва» на II квартал або на I паўгоддзе 2025 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце яе і дасылайце да 24 красавіка 2025 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.



Сярод падпісчыкаў будуць разыграны **два парнікі «Востраў камфорту» «Бабулін парнічок» і суперпрыз — цяпліца Green Apple GA–House–3x–frame Б0063899.** Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 2 мая 2025 года.

Прызы можна будзе атрымаць да 30 чэрвеня 2025 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» або «Літаратуру і мастацтва» на II квартал ці на I паўгоддзе 2025 года. Пасля 30 чэрвеня 2025 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ад падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў № 42 «Звязды» ад 1 сакавіка 2025 года.



**Тэлефоны для даведак: (017) 271–12–94, 311–17–40.**

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» або «ЛіМа» на II квартал або на I паўгоддзе 2025 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________ (аддзяленне сувязі) **на II квартал або на I паўгоддзе 2025 года**

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) ______ (індэкс) ____________________

Удачы ў розыгрышы!



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 391. Індэкс 63850. Зак. № 640.

Нумар падпісаны ў 19.30 13 сакавіка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12